Ба53 033
53033
Б Г21

ксім Гарэцкі

Досьвіткі

Дзяржаўнае
Выдавецтва Беларусі
Менск 1926 г.

ГЗ

Б Г21

Б А 53033

Максім Гарэцкі

3

ДОСЬВІТКІ

Б 8 53033

Бел. аддзел 1994 г.

Б 2033

Апавяданьні

Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі

МЕНСК—1926.

Nr. inv. 781

25. 04. 2009

ДВБ № 10. Галоўлітбел № 12870.

2 дзярж. друкарня. Зак. 104. У ліку 4000 экз.

Апавяданьні

Досьвіткі

Доўгімі зімовымі досьвіткамі чуў я, а пазьней, калі выбіўся ў сьвятлейшы сьвет, сьпісаў, як мучылі паны нашу бедную цётку Тацяну за нейкую заморскую сучку; як смажыў ім ката, заместа зайца, маладушны дзядзькакухар; як баяўся боскае кары за свой высокалюдзкі ўчынак цёмны дзядзька Тарас; як тады і высока-ўчоныя людзі, старыя профэсары, роўна з цёмнымі і няўчонымі, схілялі трудным часам галаву перад нязьведанымі сіламі прыроды; як накладалі розумам хоць мала-ўчоныя, але ўжо малаверныя і нешчасьлівыя вясковыя інтэлігенты, „дурныя настаўнікі“, за сваё прыгожае, але пустое, цёмнае шуканьне вечнага пачатку; і як выдатныя адзінкі, песьняры-музыкі нашага народу ў тым чорным часе праўдзівага досьвецьця, болем свайго сэрца ігралі страшныя песьні паняволеных пракаў волі.

Доўга цягнуцца зімовыя досьвіткі. За вокнамі цёмна і лютая сьцюжа, а ў сьцюдзёнай хаце невясёла гарыць цямнявая лучына, нудна трынкаюць марудныя верацёны. Да сьвету яшчэ далёка-далёка!

Не пяюць удосьвецьця песень, і маўклівыя пральлі толькі ціха думаюць свае ціхія досьвітныя думы.

Але бяссонны дзядуля, размачыўшы лыкі і сеўшы ў кажусе на калодачку пасярод хаты, любіць гэтым часам разьвеяць сонны сум у маладых сваімі перaказамі аб розных прыгодах з даўнае мінуўшчыны.

Пляце дзядуля старадаўнія плятні і любіць іх, як свае лапці, а ўжо яго старэйшы ўнук, яшчэ і не дзяцюк, а толькі ладны хлопчык, што ні ў вошта, аднак, ставіць лапці перад ботамі, ужо ён ня можа ўцерпіць—і перабівае ціхую стройную плынь казаньня й слуханьня. Бунтуецца яго маладое сэрца супроць незразумелай для яго пакоры панскіх падданых.

— А каб на мяне,—кажа ён дзеду,—то ўзяў-бы я добры кол, прыпільнаваў-бы пана дзе-небудзь у зручным куточку ды так-бы сьвіснуў яго поўху, што ён-бы і сваіх не пазнаў! Ня стаў-бы другі раз сячы людзей.

— Эх, братка ты мой, братка! — усьміхаецца на ўнука дзед.—Няўжо-ж ты гэтак любіш біцца? Ці табе, такому маладому, так казаць! Брыдка гэта—біцца... Але быў у нас адзін: бывала, як яго сячы, возьме кол, стане ў кут і не даецца. „Палезьце толькі! Першаму, кажа, растаўку мазгаўню“. А потым уцячэць у лес і басьцяецца дзён дзесяць. Але што-ж? Ня дзе-ж яму дзецца—вернецца сам або яго зловяць. Схопяць зьнянацку, зьвяжуць, пакладуць на ўслоне, пара людзей сядуць на ногі, пара на галаву, а трэцяя пара з двух бакоў так длупцуюць беднага, што пасьля яшчэ дзён колькі ляжыць ды стогне...

— Каб усе не даваліся, як ён, то не абсеклі-б!

Дзед толькі засьмяецца і кажа далей перарваную гісторыю.

— А каб на мяне, — ізноў замінае дзеду ўнук,—узяў-бы я карабочак сернікаў і добры пук саломы, выбраў-бы я цёмную восенную ночку і так-бы засьвяціў у панскім двары, што пан той і сваіх-бы не пазнаў.

— Эх, братка ты мой, братка!—усьміхаецца дзядуля.—Лацьвей табе цяпер казаць,—ня тое было ў даўны час. Быў у нас гэткі адзін. Бывала, як толькі восень—гарыць гумно ў нашага пана. Згарэла раз, паставіў цераз год другое. Згарэла й тое, паставіў трэцяе. А пасьля прыехалі к пану казакі, сагналі ўсіх людзей у двор, выбралі ад кожных дзесяці сем'яў па чалавеку, разлажылі іх голых на таку ў гумне. Прышоў пан, запаліў сьвечку ўвелькі з добрую качалку і ну па радоўцы падсмальваць задраныя бароды, дый пытаецца: „Ня ведаеш, пераз чый грэх спалілася гуменца ў твайго пана?“ — „Ой, паночку, зьмілуйцеся, ня ведаю“. Абышоў усіх, а ляжалі ў два рады, як снапы,—і ніхто ня ведае... —„Ну, то, кажа, як вы такія сьвятыя, што ніхто з вас ня мае грэху,—царства вам нябеснае!“ Вышаў з казакамі за вароты, сказаў заперці там нягрэшных і запаліць і гэтае гумно... Божухна-бацюхна! Пан багаты, што яму значыць спаліць гумно (пустое, бяз хлеба) і страціць сотні дзьве падданых, калі ў яго лесу таго за колькі дзён вокам ня скінуць, а падданых не адна тысяча. Завылі ўсе людцы, што стаялі вонках, кінуліся да пана, але ня з коль-

лем, а з гаручымі сьлязьмі, каб ня губіў невінаватых. Плачуць, галосяць, поўзаюць наўкол пана па зямлі, як ракі або чэрві.—„Запалівайце!—крычыць пан,—мае людзі, мой адказ!“ Хацелі ўжо казакі паліць, аж крычыць з гумна адзін: „Мой грэх!“ Выпусьцілі ўсіх, а яго зьвязалі, павязьлі некуды скрозь ноч. Дзейкалі ў нас людзі, што спаліў яго пан у лесе. Можа праўда, можа—не, толькі ўжо ён прапаў недзе навекі, ніколі не вярнуўся. А начальству пан сыпнуў грошы, каб ня слухала людзкіх дзейканьняў і ня шукала чалавека. Сам-жа пан быў і начальнік...

— Каб усім кагалам кінуліся на пана, то не прапаў-бы чалавек,—сьпіраецца задуманы хлапец.

— Эх, братка ты мой, братка!—ківае галавою дзед:—паглядзім, што-то ўжо будзе з вас, маладых ды бойкіх.

Маўчыць тады, бывала, малады ўнук.

І так цягнуцца доўгія - доўгія зімовыя досьвіткі... Да сьвету яшчэ далёка, і кажа дзед, як загінуў малады Васіль, што кахаў харошую дзяўчынку-немку, і любіў ён малявать, і як зьвялася па сьмерці дзедавага дзеда багатая пчэльня, і як трасла дзедавага дзядзьку трасца, здаўшыся яму начою ў лесе нямою бабаю...

— Ня йме́цца веры, дзедку, у тое, што ты кажаш,—усьміхаецца нарэшце-такі і ўнук. —Трасца ня можа здацца бабаю, бо гэта ёсьць толькі хвароба.

— Можа й так,—пакорна згаджаецца дзядуля,—а людзі кажуць, і я кажу... Мне самому нічога ніколі не здавалася. Вам-жа, маладым, лепей тое ведаць, бо вам у школе кажуць, а нам, цёмным, што... Што мы ведаем?..

— Як чалавек хворы, дык яму тады здаецца ў хворых мазгох...—сьпяшаецца ласкавей сказаць унук, бо цяпер жаль ён чуе да свайго цёмнага, пакорнага дзядулі...

ЕССР
імені
ЛЕНІНА

Панская сучка

I

— Ну хто заступіць ім Лэдзі? Ніхто!..

— Ах, гэткае няшчасьце, гэткае няшчасьце, пане мой!—казаў князь Вішнявецкі грапу Пшазьдзецкаму і знэрваваны хадзіў па габінэце.

— О, так, так, каханы пане!—паслужна патураў госьць.—Я чуў, што пане князь даў за сваю Лэдзі колёсальную цану?

— Але-ж не, пане мой! Ня надта ўжо і дорага. Я аддаў Любамірскаму за маю гаротную Лэдзіньку некалькі душ падданных. Эт, у выселках, пане, жылі, у ройстах, рогам убіўшыся ў Любамірскага загоны. Ну, колькі сем'яў перагналі бліжэй сюды, а тых, рэшту, з кавалкамі балота, я адступіў суседу за Лэдзі. Ды не ў цане тэй справа, пане мой! А не ў цане! То-ж гэткая мне страта...

— О, так, так, каханы пане!

— Няхай аджываць мне маю Лэдзі, і я кіну за гэта ўдвойчы, утройчы болей—колькі хочаце!—сем'яў. Але-ж яна ўжо—ня жыве... Сканала мая галубка ўдосьвецьця, гадзіне а палове сёмай, пане мой. Ніякая вэтэрынарыя не дала тут рады. Доктар спачатку даў на-

дзею, што Лэдзінька напэўна ачуняе, і я меў тое безгалоўе—адпусьціў яго дамоў, не пачакаўшы лепшае гадзіны. Мой уласны вэтэрынар... але не! Я не магу, не магу супакойна ўздумаць на яго...

І князь паплёскаў далоняй аб далонь.

Нячутна адчыніліся ў габінэт дзьверы, нячутна, як тая здань, даўся на вочы камэрдынэр, з сівымі бародкамі ля вух і ў золатам вышытай, фамільнай князеўскай ліўрэі.

— Хлоп слухае яснавяльможнага пана!

— Скажы камісару, пану Міхалу, што вэтэрынара Будзьку аддаём у войска за няздольнасьць у яго адумысловай працы. Выправіць заўтра ўраньні.

Грабя Пшазьдзецкі быццам меўся нешта сказаць, але, як на тое, дапіваў віно, ён папярхнуўся і закашляўся, а ў той час камэрдынэр вышаў.

— Лэдзі, Лэдзі!—засігаў князь з кута ў кут.—Бач, мой пане, нарадзілася яна ў Ангельшчыне, і радавод яе ня горшы, чымся якога літоўскага шляхціца з драбнейшых. О! Прывёз яе бацька Любамірскага, нябожчык пан Ксавэры, пухам яму зямелька. Ах, і што-ж то быў за знаўца і цаніцель! Сынок цяпер старанна абкругляе валадарства, але пары слоў ня зьвяжа, блазень, у сабачых справах. І вось я дастаў ад яго Лэдзі. Яна прышла ў мой дом. Пане! я-ж дрыжэў над ёю, я-ж яе кукобіў... Заўжды спала яна, мая галубка, ля маіх ног. І навошта мне было спускаць яе з Сангушкавым кабялём? Скажэце, пане мой, навошта,

а? Ці-ж гэткія далікатныя, гэткія кволыя стварэньні пана бога прызначаны быць маткамі? Вось я бачу, яна ўся ў маіх вачох. Памятаеце, пане? Якая плястыка, а? Якое хараство правільных ліній! Якая духоўная выразнасьць кожнага мускулу, кожнае жылкі! А стойка? А як яна мяне любіла! А, пане мой, скажу зусім без перавышкі... ці ўва ўсёй Польшчы і Ліцьве быў калі сабака, лепшы за яе? Ай, Лэдзі, Лэдзі!.. На тых вялікіх ловах у Панятоўскага, дзе быў з сваім услаўленым сабакам кароль Прусаў, мая Лэдзі была лепшай за ўсіх панскіх і каралеўскіх сабак...

— О, так, так, мой залаценькі пане! То-ж гэткія Лэдзі нараджаюцца ня вельмі часта сярод сабак, як гэніі і таленты сярод людзей,—казаў Пшазьдзецкі.—А паважуся спытацца: шчанючочкі... яны засталіся жывыя, пан бог хаваў?

— Так.

— Ну, то дзякаваць пану богу! Як мне здаецца, дык гора каханага князя павінна зьменшыцца надзеяй на шчанючкоў. Уважаю на тое, што яны-ж дзеткі слаўнай Лэдзі. Дый Сангушкаў сабака, я ведаю, добры сабака. Гадок ці паўтара—і ў каханага князя будзе некалькі добрых Лэдзі.

— Так, так... Засталіся сьляпенькія, нядужыя. Здохнуць.

— Зьмілуйцеся, мой каханы пане! Пры добрым а пільным доглядзе, пры належным клопаце ня могуць яны здохнуць,—выкачаюцца.

— Але не, пане! Бач, яны нават лактаць ня здолеюць, ім трэба ссаць.

— Рацыя, рацыя, мой каханы пане. Але-ж ведаю некалькі прыпадкаў, што зьвераняткі, пакінутыя ў гэткім стане, гадаваліся.

— Ну хто заступіць ім Лэдзі? Ніхто!

— Так, гэта рэч няпростая. Але памяркуем...

Грабя ўзяў зялезны кіёчак і біў вугальле ў каміне. Чырвоны водбліск ківаўся на яго вялікай і магутнай постаці. Даўгія вусы з гонарам віселі па бакох вуснаў, што грэбліва, папанску, выпіналіся.

— Мне прышло ўдум штосьці добрае, мой каханы пане,—сказаў ён і павярнуўся галавою ў бок да гаспадара:—сёньня на паляваньні стары палясоўшчык пераказаў мне цікаўную прыгоду. Можа казка, можа—не. Спазьнілася адноўчы ў полі мужычка з дзіцёначкам. Мядзьведзь злавіў яе і з дзіцёнкам прыцягнуў у сваю мярлогу. Быў удавец,—мядзьведзіца яго здохла, пакінуўшы дзяцей,—дык залучыў бабу, каб была ў яго за гаспадыню. Баба выкарміла медзьвянят разам з сваім дзіцёнкам. Мядзьведзь, як лыцар, дбаў аб усёй сямейцы, прынасіў мёду, хлеба і ўсяго, што задавалася сьцягнуць на полі ў мужыкоў, у вульлёх, у зямца і абы-дзе. Калі медзьвяняты падрасьлі, добры іх бацька пусьціў тую мамку на волю, нават паднёс, кажуць, яе хлапца да самага поля.

— З гэтага выпадае, пане?..

— З гэтага выпадае, мой каханы пане, што дабрачынная мужычка знойдзецца і для Лэдзіных сіротак!

— Думка не благая! Толькі мне замінае тое, што нашыя хлопы яшчэ надта цёмныя, дурныя... Баба, напэўна, не зразумее, што моральнай крыўды для яе асобы тут няма, калі ходзіць аб выратаваньні сіротак... А я, пане мой, хоць можа гэта сьмех, ня хочу зьвязваць такіх, таго... такіх бабскіх пачуцьцяў з успамінкамі аб маёй Лэдзі. Не, ня хочу!

— О, то-то-то! У словах каханага пана чуецца даўгое быцьцё ў Ангельшчыне. А я скажу пану: я болей за каханага бавіў час у нашых баславёных пушчах і дух нашых хлопаў я, мой залаты пане, до-о-бра ведаю. Пане! любая баба за гонар будзе лічыць і пойдзе з прыемнасьцю... Пабыць у самым замку!—для іх то гэта вялікае шчасьце...

— Так, мой пане. Але я, таго... не хацеў-бы я, каб гэта пачалося ад мяне.

— Божухна мой! Толькі міргніце аканому ці там войту...

— А ўсё-ж, таго, няпрыемна. І толькі дзеля свае Лэдзі, дзеля яе бездапаможненькіх сіротак, я складу ўсякую ахвяру. Ай, Лэдзі, Лэдзі мая! Яе ўжо няма.

II

— Забіце, замучце--непаеду а!..

Поўны клопату, стары войт Рымарчук зраньня быў ня ў гумары і ў думках пасылаў да ўсіх чартоў здохлую заморскую сучку.

За яе, праклятую, то й дзіві, і сам страціш панскую ласку. Дапраўды, і не яго-то, войтаўскі, абавязак клапаціць аб тым, што дзеецца ў самым замку. Але ён—стары, зьведаны служака, і на яго валяць усе труднейшыя і няпрыемныя даручэньні. Рымарчук, ідучы ў чорную хату, клапатліва загінаў пальцы: вэтэрынара да вайсковага начальніка выслалі (тут войт з прыкрасьцю зморшчыўся, успомніўшы сьлёзы і выцьцё); ямку сучцы ў старым парку капаюць; з заказам на помнік у N ужо паехалі; псара Яську, што забыўся наказаць апальшчыку сагрэць пакой, дзе шчаняткі, абсеклі; застаецца глаўнае і самае дрэннае: знайсьці і даставіць у замак мамку. І як мага барджэй. Каб цябе ліха—дзе-ж яе так зараз знойдзеш? Але ведама, што ў пяцёх акругах ёсьць мамкі. Толькі ўсё надта далёкія, вёрст за дваццаць, трыццаць і далей. Трэба гнаць пасланцоў па ўсіх, а самому трэба ехаць па самую бліжэйшую. Каля чорнай хаты ўжо прыбіралі яму вазок, але пасланцы ня ўсе справіліся, і войт узлаваўся і падняў на іх галас, дражліва паравёў марудных бізуном, што насіў за паясом, як адзнаку войта. З крыкамі і лаянкаю сеў ён у вазок, піхнуў паваждая ў сьпіну і пакаціў па мамку...

Бязьлюднае сьнегавое поле супакайвала.

Шэра і аднастайна было наўкола. Ані жывой душы. Прыдарожныя бярозы бязуважна нудзіліся ў сваім сярэбраным прыбраньні. На ўзгорачку, у кусточку пырхала нейкая азызлая птушачка з чырвоным волем. І сумныя ці

няўважна-зачарствелыя вароны не агалашалі сваім грубым карканьнем зімавых палёў.

У мутна-бялёсых далях, за грабеньнем, курганьнем і гурбамі, сьнегу маячылі зубчатыя сьцены, вежы замкаў званьніцы, дзівосныя горы, агорнутыя воблачкамі. Ды не: мужыцкія там хаты, як завеяныя завірухаю грудкі гною, выплываюць здалёк, сярод адзінотных бяроз і калодзежных сох з вагамі.

Уецца сіні дымок над страхою. Дзьмухнуў адтуль вецер і прынёс пах смаленай бяросты, дыму і жыльля.

Пуста на вуліцы, заваленай хваросьцем і карчамі з ляда. Пратоптаны вузенькія сьцежачкі ад хаты да хаты, да паграбні і да гуменца.

Мятнулася з грэбнем і мычкамі лёну дзеўка і, спуджаная, таго-ж часу дзесь прапала. За рогам стаяла грамадка мужыкоў з сякерамі за паясамі, у шапках-віславухах. Яны невясёла гаманілі аб нечым з дзедам, што нёс у рэзьвінах рыжую асаку.

Зазьвінелі, заскрыпелі палазы пад вазком— бліжэй, бліжэй! І ўсе мужыкі, хапаючыся, скінулі шапкі да пояса.

— Дзень добры, людзюхны!

— Дзень добры пану войту!

— А дзе тут жывець Тацяна Турботная?

— А вунацька тама, просім пана, тамацька на рагу, за крыніцаю жывуць Турботныя.

І колькі хлопаў паслужна замахалі рукамі і аблавухамі і пабеглі наперад паказваць.

Нізкія хацінкі і пуні ўехалі ў зямлю. Малюпаценькія акенцы, як бельмы на воку ў

жаласнага старца, тусклелі ў бедных пузырамі, ў багатыроў—мутным і таўстым бутэлечным шклом. Саламяныя маты і падстрэшшы закурэлі. Хаты курныя, без каміноў, і дым пракурыў усе шчэлачкі. Стрэхі з нізкімі шчытамі і акапамі. Сьцены абкладзены саломаю ці канаплянаю сувалкаю—дзеля цяпла. Гэта дом прыгоньніка, панскага падданага, гэта яго зьвярынае логава.

Пад'яжджаючы да Турботных, войт няпрыемна ўразіўся: на вуліцы, ля сьцяны стаяў царкеўны дзераўляны крыж.

— Хаўтуры ў іх. Дзіцёнак у Турбоціхі памёр,—сказалі войту.

Ён нізка нахінуўся і ўвашоў у хату. Печ была толькі зачынена, і елкі дым яшчэ вісеў пад стольлю і еў вочы. На лаўцы ляжаў пад белым грубым палатном, з венчыкамі на галоўцы, сьсінелы маленькі дзіцёнак. Перад абразамі цеплілася жоўтым агоньчыкам чорная сьвечачка—падарунак якога-небудзь дзядзькі Ярмолы, тутэйшага зямца. Пад палком брыкала ў саломцы цялё; запёртая пад печаю курачка сакатала. У запечак забіліся, як зьвяркі, дзеці—дзяўчынкі. Сядзела ў кажухох некалькі спагадніц-цётак. Матка галасіла па дзіцяці:

А мой-жа ты дзетачка,
А мой-жа ты галубятачка!
Я-ж цябе вынасіла, выхварала,
На прыгон у кашолцы насіла,
Сама жытца панскае жала,
Цябе снапочкамі ад сонца загараджала.
А ты-ж мой дрыжоны сынулечка...

Хто-ж мяне пад старасьць прыгледзіць,
Кавалачак хлебца прыдбаець,
Хто-ж мне прыгон служыць пасобіць?

— Цартва нябеснае,—пераксьціўся войт і ўздумаў адразу пачаць гутарку аб справе. Бабы далі яму месца на лаўцы, змахнулі пыл хвартухом. Адна бабулька пачала гамаваць матку:

— Супакойся, мая любая. Няхай бог крыець, як ты гаруеш, быццам па вялікім. Супакойся, рыбухна.

Неспадзяваная ўзьяўка войта ўразіла ўсіх і сьціскала. Усе чакалі.

Абчысьціўшы вусы ад лёду, Рымарчук ня зусім адважна і ня надта складна загаманіў:

— Вось што, Тацяначка. Трэба табе цяпер-жа ехаць са мною ў князеў палац.

— Няшчасьцейка ў мяне, пане любенькі... Аслабаніце, калі ласка панская. Ня ведаю, навошта я тамацька патрэбна ў гэткі час?

— Там... бач, мамкі патрэбны. Чалавечае малако на лекі ці што патрэбна,—няўдалымі словамі напалохаў ён баб.

— Ой, нешта ня так, паночку даражэнькі, кажыце нам усю праўду.

— Рыхтуйся, Тацяна. Праўды вам заманулася. Можа трапіцца ўсяго дзень які пабавіць, потым другую прывязуць.

Баба бухнула ў ногі.

— Паночку наш залаценькі! Абаронца наш! Зьмілуйцеся! Дайце-ж мне самой пахаваць майго дробненькага.

Войт змагаўся і ня ведаў, як зрабіць. Здань панскага гневу палохала яго. Надаўшы паважнасьці, Рымарчук злосна буркануў:

— Няма там чаго.. Зараз-жа рыхтуйся!

Баба абхапіла яго за ногі і завыла. Ён, нарэшце, выпрастаўся і закрычэў ужо грозна, як прызвычаіўся за шмат гадоў вайтоўства.

Але баба раптам перамянілася.

— Не паеду!! Забіце, замучце—не паеду я!.. Не пайду ад свайго сыночка. Не аддам яго малачка на панскія лекі... Не паеду!

Гэта было навіною Рымарчуку. І ён замяўся, ня ведаючы, што рабіць.

— Ну, ну, ну...—казаў войт,—пакрычы, каб князь пачуў,—дурное бабства. Сёньня-ж увечары прыяжджай: пасьпееш пахаваць. Так і мужыку скажы. Ён дзе?

— На прыгоне... У лесе калоды валочыць на сплаў,—адказалі бабулі за яе, бо маўчала.

— Так і яму перакажыце.

Войт паехаў.

Па дарозе, воддаль ад цяжкага бачаньня, ён пачаў каяцца, што ня ўзяў адразу. „Ну ды нічога; мажа, прывязуць мамку яшчэ адкуль“,—цешыў ён сябе.

Насустрач ехаў хлоп з возам карчоў і, угледзіўшы войта, хапатліва збочыў, тапіўся ў сьнезе каля вязнуўшага каня і скінуў шапку. Сабачка яго заліўся ярым гаўканьнем і кінуўся да вазка.

Войт з задаваленьнем працягнуў па сабачцы бізуном і ахінуўся кажухом цяплей.

Б 53038



Бязьлюднае сьнегавое поле ізноў супакайвала, але зараджала ў глыбакосьцях душы нязнаную нуду.

III.

— Закапаць іх разам з Лэдзі!

— Ну, войт, вязеш бабу?—сустрэў Рымарчука ля замку камісар увечары.

Войт доўга меркаваў, як адказаць.

— А ці з далёкіх ні аднэй не прывязьлі, вашмосьць?—спытаўся ён.

— Хто-ж павінен ведаць? Для чаго ёсьць войт? Ты езьдзіў па бліжэйшую?

— Я, так, вашмосьць. Незабавам, пане, прывязуць бабу.

— А шчаняты дагэтуль некармлёныя! Сьцеражыся, войце! Князь не падзівуе, што ты войт.

А князь сядзеў на кукярэчках ля лубачкі ў пакоі шчанятак і бедаваў. Яшчэ трое шавалілісь і барохталісь, жаласна канькалі і лезьлі адно на аднаго. А самы дробненькі ляжаў нярухома, у бачку, закруціў галоўку і выцягнуў лапкі. Ён здыхаў. Стаялі сподачкі з малаком. Стаялі пачціва ля дзьвярэй сівы камэрдынэр і засмучоны псар Яська.

— Мае гаротныя лэдзіняткі! Мае бяздольныя дробныя цюцечкі,—квохаў князь, гладзячы мякенькую шэрстачку, і з любасьцю пачуваў, як піхаюць у яго руку голыя мордачкі і жаласна хныкаюць.

— Ну, што-ж баба? Дзе-ж баба?—раздражнёна пытаўся князь, ня гледзячы на людзей.

— Няма яшчэ, яснавяльможны пане,—казаў камэрдынэр, а Яська гмурыўся й маўчаў.

— Хто паехаў па бліжэйшую?

— Сам войт Рымарчук.

— Ї гэнага старога дурня дагэтуль няма?
Чалядзінцы маўчалі.

— Зараз-жа даведацца і прыслаць яго сюды. У-у, бэлдасы,—зусім выходзіў князь з прызвычаёнай ангельскай роўнаважнасьці. Ї пана Міхала гукнуць!—дадаў ён.

Калі ўзьявіліся ўстрывожаны камісар і дрыжачы Рымарчук, князь быў грозен. Твар наліўся крывёю, мускул на шчацэ скакаў, нос пашызеў.

— Дзівуйся, дзівуйся!—пацягнуў ён войта за палу жупана.—Ты замардаваў іх галоднаю сьмерцю. Яны ўміраюць... гэты ўжо канае. Ты ня маеш міласьлівасьці, закаржэлы хлоп. Ты правалаводзіў цалюткі дзень дарма, псякрэў твоя. Ты надта даўна войтам, агідны сьмерд. Ты прызвык лупцаваць хлопаў, і цябе мала абходзіць труд бедных драбнютак мае бяздольнае Лэдзі.—Князь намагаўся стрымацца й ня мог.—Да д'яблаў гэтага нягоднага лайдака,—неспадзявана для сябе зароў ён, зьвярнуўшыся да пана Міхала,—у найдалейшую вёску, простым хлопам яго, брыдкога, пад пільнае дагляданьне старасты!

Ї, пусьціўшы Рымарчука, галасаваў:

— Вон! Далоў з воч маіх, пракляты сьмерд!
Войт, зьнямеўшы, паплёўся ў дзьверы

— Слухаю, яснавяльможнага пана,—пракулдыячыў пан Міхал.

— Слухаеце? Вы—слухаеце! Работу трэба рабіць. Їдзеце сабе...

І князь сам пашоў у пакоі. Пан Міхал засіпеў штосьці на камэрдынэра, на Яську, пасыкнуўся быў да шчанят і вопрамець рынуўся з замку.

Перапуд пашоў сярод чэлядзі і ўсіх людзей. Забегалі туды-сюды з ліхтарамі. Зазьвінелі балабончыкамі хамуты. Сядалі вершнікі, гаўкалі сабакі. Пан Міхал кідаўся па двары і сыпаў праклёны і тэўхалі направа і налева. Паскакалі пасланцы ўва ўсе бакі сустракаць мамак. Гайдук памчаўся ў саначках на скараходзе па Тацяну. А войт сядзеў у пякарні, як хмара. Ніхто ня важыўся ўмаўляць яго. А ён яшчэ ня мог дасканала ўцяміць, што было, і прызвычаіцца да навіны. Адна думка сьвердліла галаву: як ён мог так зблагаваць? Паехаў сам-а-сам па бабу і ня прывёз. Як ён ня сьцяміў тады? Але ўжо не паправіць, прапаў... Пан Міхал, зірнуўшы на момант, грэбліва і злараднасна ахапіў яго поглядам і буркануў: „Псякрэў! Наробіў бяды. Будзеш ты цяпер ведаць у мяне“.

Пад поўнач прывязьлі Турботную і ўрынулі к шчанюком.

А пад раньне і тыя трое здохлі.

Увесь замак ведаў і прыцішыўся перад гразою, чакаў князеўскага абуджэньня.

І князь прачнуўся.

— Прачнуўся, прачнуўся, зашасьцела па ўсіх закутках замку, праняслося па двары і ў чорных хатах.

Князь у халаце прашоў да шчанятак. Яго адвярнула: брыдкая, нячыстая, зарумзаная бабішча забілася ў кут, як сава. Падхапілася і рушыла цалаваць князю ў руку. Ён з гідасьцю адхапіў і схаваў руку за сьпіну. З нецярплівай цікавасьцю падышоў да лубачкі і проста зьнямеў: гідкія, нечым аблітыя, ускалмачаныя, з вялізнымі брухамі, раскірэчыўшы каляныя лапкі, ляжалі нежывыя дзеці сьлічнай Лэдзі.

Моўчкі пашоў магнат у габінэт, пляснуў у ладкі і загадаў ґукнуць камісара.

— Ведаеце?—каротка спытаўся ён і ня вітаўся, калі прадстануў пан Міхал.

— Ведаю, пане яснавяльможны, няшчасьце...

— Чаму гэта?

— Трэба ўважаць, баба абкарміла іх сваім папсаваным малаком, пане яснавяльможны.

— Абкарміла? Ды як-жа яна пасьмела?! Можа быць наўмысьля? Можа быць пачуцьцё пакрыўджанае маткі? О, якая грубасьць, якая нялюдзкасьць у гэным дзікунскім куце! А можа быць і сваволя? Так, так, бязумоўна, сваволя. Тут усе распусьціліся. Распусьціўся войт, распусьцілася чэлядзь, хлопы... Я ня ведаю дзеля чаго я маю камісара. Дзе выкапалі гэтую страшную бабу? Гэтую душагубку? У яе выгляд сапраўднай ведзьмы! Абкарміла, ха, ха! Накарміце ж яе самую так, каб аж піць папрасіла! Можаце ісьці. Падбадрыце распушчонікаў. Ага... узвараціць вэтэрынара Будзьку: няхай дасьледуе, чаму акалелі шчанюкі? Закапаць іх разам з Лэдзі,

IV

— *Як накарміць чалавека, каб аж піць папрасіў?*

Пан Міхал уцяшаўся, што бяда блізка што мінулася. Адылі ўцяшаўся з асьцярогаю, каб ногды не давялося расчараввацца. „Накармеце-ж яе самую так, каб аж піць папрасіла!“ Чорт ведае, што гэта значыць? А трэба ўцяміць і ў дасканаласьці выканаць; доля войта зусім няваблівая. Рымарчук—хлоп; узьнесены панскаю ласкаю на высакосьці вайтоўства—сьмерд; яму лягчэй зрабіцца ізноў тым самым, чым быў некалі. А пан Міхал—шляхціц, хоць і заняпалы; яму ня зьнесьці сораму. Трэба старацца. Балазе, дагэтуль ішло баразною.

— Скажы ты мне, Яська, як накарміць чалавека, каб аж піць папрасіў, а?—спытаўся ён, сустрэўшы сабакара.

Той не зразумеў, прыняў за жарты і стараўся патрапіць пад панскі гумар; ён адказаў:

— Накарміць трэба ўволю, ласкавы пане.

— Накарміць? Ды мне па добрым абедзе курыць толькі хочацца, разумееш?

— А мне—піць. Анэгдай пасьля смажонага селядца я паўкухля квасу выжлуктаў у кухара, ласкавы пане.

— Ага, так, так, так! Па селядцу значыцца?

— Пасьля лазьні надта піць карціць, ласкавы пане

— Ага, пасьля лазьні яшчэ, Яська? Добра, добра,—ты разумны хлоп, псар Яська.

— Сабакары ўсе мудрагелі,—вышчэрыўся Яська.

— Ну, ідзі сабе да сваіх сабак, ато ізноў на што забудзешся.

— Дармоўшчына была, паночку...

— Ну, ну, пагамані ў мяне!

Пан Міхал пасьля размовы з псаром Яськам прасьвятлеў. Хоць не выпадае так доўга гутарыць яму са сьмердам, нядаўна абсечаным, ды нічога: гэны сьмерд, чорт яму сябра, падаў добрую думку. Князеўская воля будзе споўнена як сьлед.

У садзе за старою афіцынаю аконама ліпела над заплытым стаўком старэнькая акінутая лазенька. Камісар загадаў, каб як найбарджэй зрабіць у ёй парадак і пачаць грэць. У лазеньку ўмясьцілі Тацяну Турботную і замкнулі на замок там, дзе парацца. Ключ паклаў сабе ў кішэню пан Міхал.

— Скрозь вакенца даваць па пяць селядцоў ураньні і ўвечары, а болей нічога не даваць. Няхай есьць уволю, каб аж піцюхны пабажала. Цяпло ў печцы ня спускаць дзень і ноч, ды болей пары паддаваць, ато азызьне галубка,—казаў пан Міхал гайдуку,—паліць як найжарчэй, селядцы выбіраць, як найсальней.

Тры дні, тры ночы стагнала, хрыпела і драпала сьцены зьнямоглая ад смагі, хворая, ашалелая баба.

Ужо й Будзьку павярнулі. Ужо ён з радасьці пацьвярдзіў, пусьціўшчы ў ход усё сваё вэтэрынарскае веданьне, што, дапраўды, шча-

нятаў баба абкарміла малаком. Надта проста, што й сумысьля, бо ўмеюць-жа яны карміць сваіх, не абкармліваюць. Ужо князь, захапіўшы гатоўку ў глаўнай канторы і даўшы нарад фальваркам, закручаны ў мядзьведжу поўсьць, на шасцьёрцы цугам шэрых з яблыкамі, пакаціў у бясклопатна-вясёлую Варшаву, маючы далейшы кірунак на Парыж і Лёндон, далей, далей ад старонкі дзікунства, зганеньня і забабонаў, што па дзіўной іроніі дае князю залатыя звонкія чырвонцы.

Перад выяжджаньнем князя, пану Міхалу надта карціла пахваліцца, як здагадна зацеіў ён тую ведзьму папрасіць напіцца, але не паважыўся турбаваць яго сьветласьці драбніцамі.

Варкатаў камісар пад нос сабе: „За Нёман, за Нёман“... і адзягаў патранташ, рыхтаваўся прайсьціся па парошы з бутэлечкай „погжэбовэго“ пазайчышках, а вось гайдук прышоў з паведамленьнем, што баба сьціхла.

Знашлі яе на памосьце з абдрапанымі да крыві рукамі і грудзьмі, з шырока разьзяўленым ротам. Камісар зьбянтэжыўся і накінуўся на гайдука з папікамі і лаянкаю, чаму не сказалі раней, што яна ўжо такая. Са страху ён забыўся на сваю панскасьць, прутка сарваў з пляча торбачку, выхапіў пляшку, і частку „погжэбовэго“ ўліў у няпрыгожы і страшны бабін рот...

Пасьля колькіх хвілін прыкрага для ўсіх чаканьня яна захрыпела і, душачыся, лыкнула ўліты ёй у самае горла сьпірытус.

Узвалілі яе на розвальні, прыкрылі паверх кажуха дзяругаю. Паважны і хмуры Яська павёз яе дамоў.

V

— Вечны спакой!

Магнат Вішнявецкі ізноў узьявіўся ў варшаўскіх салёнах, асабліва цікавы і як казалі далікатныя пані і паненкі, „нявыслоўна адухоўлены“ пасьля самоты ў сваіх беларускіх пушчах. Усе ведалі, што славутая Лэдзі, якою вабіўся кароль Прусаў на пышных ловах у Панятоўскага, без пары згінула. Грабя Пшазьдзецкі пазычаў у князя грошы і ня ў меру вёрз лухту аб яго новых поглядах, памеўшых поўную незадачу пры першым датыканьні з консэрватызмам хлопаў.

Гутарка аб гаротнай Лэдзі зрабілася моднаю ў арыстократычных салёнах.

А маладзенькая жартаўлівая барöнэса Фальц-Фэйн гарэзьліва пяяла засмучонаму князю на жалосна-сьмяхотную мэлёдыю:

Ґаў, гаў, гаў, сучачка!
Ґаў, гаў, гаў, цюцечка!
Вечны спакой!
Без пары згінула,
Дзетак пакінула,—
Вечны спакой!
Ой, лэдзінятачкі,
Дробны шчанятачкі,
Вечны спакой!..

Смачны заяц

I

> Але колькі ўжо прыпадкаў было ў гісторыі, што з самае вяршыні шчасьця чалавек раптоўна звальваўся ў самае бяздоньне плачу і адчаю.

Князь забіў на ловах пару вялікіх, прыгожых ласёў. Вясёлы, здаволены, бязупынку гамонячы з гасьцьмі, вярнуўся ён да вечару дамоў і заказаў кухару засмажыць адменнага зайца, што забіў учора лоўчы на сьнягу ў пушчы.

Тлусты, чырвоны той заяц ужо ляжаў на стале ў пякарні, і кухар жвава завінуўся ля яго.

Умельствам кухара ганарыўся сам князь і часта хваліўся гасьцём, што другога такога кухара ўва ўсім краі няма.

Кухар гэта ведаў і пільнаваўся ня выскачыць з свае славы.

Сёньня ён асабліва стараўся: князь вярнуўся вясёлы, госьці рагочуць, абед будзе з паляўнічай выпіўкай, — можна і гасьцінца спадзявацца ад іх, а князь назаўтрае пахваліць і добрым часам дасьць чарку гарэлкі.

А не дагодзіш — бяда: зараз пацягнуць гайдукі на стайню і так адсмаляць раменнымі бічамі, што цэлы тыдзень будзе ані сесьці, ані легчы.

Быў адзін прыпадак,—і кухар засмуціўся, спомніўшы... Перасаліў ён страву, і князь сам, сваёю цяжкою рукою, так ударыў яго два разы поўху; што й цяпер яшчэ ў благое надвор'е з вуха гной цячэць. З гэтае прычыны кухар заўсёды насіў у вуху кавалачак мяккага хлопу і дрэнна чуў.

І ці мала было такіх выпадкаў, што забіўбы яго гнеўны князь да сьмерці ці аддаў-бы ў маскалі, каб не даражыў яго залатымі рукамі і тонкім кухарскім смакам.

Пасьля калецтва прыкра было бачыць князю кухара з заткнутым вухам, і ён ніколі ўжо ня гукаў яго на параду аб стравах да сябе, а пераказваў яму ўсе свае загады цераз стольніка.

Ды сёньня князь быў у такім нязвычным гумары, што захацеў, апрача стольніка, і сам пагаманіць з ім, як смажыць зайца.

Калі хлопчык-гайдучок прыбег з палацу да кухара ў пякарню, а яна зьмяшчалася воддаль, у васобным, адумысным будыначку, калі ён запыхана крыкнуў кухару: „Дзядзьку ясна-вяльможны кліча да сябе... барджэй!“ — у кухара затрэсьліся ад неспадзевак рукі і зазьвінела ў хворым вуху. Ён ня ведаў, палохацца ці радавацца яму, што кліча яго князь.

Падняў уронены рушнік, абцёр з рукі зайцову кроў і рупненька прыгладзіў лысіну і падкруціў вус.

— Піражка... піражка, Янучок! — сарамліва, без роўнавагі зашаптаў ён гайдучку, азірнуўся,

каб хто ня ўбачыў, схапіў з духоўкі румяны піражок і ўсунуў хлопчыку ў кішэню за добру ці нядобру вестку.

Хлопчык усьцешыўся, пагладзіў вялізнага адгадаванага ката, князёвага ўлюбёнца, што быў тут прыбегшы за хлопчыкам з пакояў, і паганяў дзядзьку: „Барджэй, барджэй, чакае!“

І зараз паляцелі: халопчык паперадзе, а кухар сьледам, на бягу спушчаючы засуканыя рукавы.

Толькі мышасты кот застаўся, зачынены праз недагляд у кухні. Ён важна пахадзіў па ўсіх сталох, панюхаў зайца і зморшчыўся, потым скокнуў і падзівіўся скрозь няшчытна зачыненыя дзьверы з кухні ў чорны прыкухоньнік, як там два кухцікі, судамой і хлапецдрыванос былі кожны пры сваёй рабоце.

Кату прыемна засьвярбела ў носе, ён глыбока пацягнуў пах ад вялізнае гарачае пліты, на якой бяз ліку стаяла рознага судзіньня з гатаванымі стравамі, клубілася з катла пара, шляхатала вада, сіпелі скавародкі, трашчэлі дровы ў печы. Але блісканьне на паліцах соцень медных рондляў усялякай велічыні, ад самага большага, увелькі з цэбар, да самага маленечкага, з катову галаву,—не спадабалася яму.

Там былі адчынены другія дзьверы, і скрозь іх цягнула холадам, можна было выскачыць на двор, але пануры выгляд кухароў, асабліва-ж хлопец-дрыванос з вяроўкаю ў руках не спадабаліся князёваму ўлюбёнцу, і ён пашоў, задраўшы тоўсты хвост, назад.

Вучоны да ўсякіх штук, кот падскочыў, ударыўся аб клямку і рашчыніў дзьверы. У сенцах узьлез на паліцу і настабурчыўся: пачуў, быццам скрабаюцца мышы ў скрынцы з прыпасамі...

Тымчасам у дзьверы вытыркнуліся з надвор'я морды двух хартоў — тонкіх, як вужакі, сагнутых дугою. Адзін з іх пацягнуў носам і зараз зьнюхаў зайца. Мякка, нячутна падышоў да столу, задраў войструю морду, схапіў у шырачэнную зяпу зайцаву галаву і цмыгнуў з сваім радым сябрам на двор у хартоўню...

Усьцешаны варочаўся назад галоўны кухар: князь быў да яго дужа ласкавы, пагаманіў з ім і нават даў пацалаваць сабе ў руку.

Але колькі ўжо прыпадкаў было ў гісторыі, што з самае вяршыні шчасьця чалавек раптоўна звальваўся ў самае бяздоньне плачу і адчаю.

Шчасьлівы кухар, праходзячы каля хартоўні, пачуў, што ў пуньцы—хрумстаньне, жвяканьне і ціхае вурчэньне... Харты нешта жаруць!

Сэрца яго ёкнула: ці не зайца сьцягнулі праклятыя сабакі, падобныя да чартоў?

Угрунь пабег ён да свае кухні, ускочыў, падбег к сталу,—зайца няма! Болем пеканула яму ў сэрца. Ён кінуўся ў чорны прыкухоньнік, шыбка аглядзеў усё і ўсіх. Зайца ня было, і кожны ціха займаўся сваёю работаю Як-бы за якой справай вышаў кухар ізноў на двор і марудна, прыціснуты няшчасьцем, паплёўся

міма хартоўні, асьцярожна паглядаючы ў бок на сабачыя пунькі. Вось паказалася з аднае хартовая галава: морда ў крыві, вочы заплылі хіжаю сыцьцю, і ў зубох штось тырчыць... Хорт аблізнуўся, і з зяпы выпала зайчая лапка.

Кухар панура пацягнуўся назад.

Увашоўшы ў сенцы, ён прастоіў там, як няпрытомны, і мімаволі задраў галаву, шукаючы крука, каб хаця й засіліцца навекі.

І тут яшчэ раз трэба сказаць, што чалавек ніколі ня ведае, дзе згубіць, а дзе знойдзе. І няма такой злыбеды на сьвеце, на якую-б ня ўсьміхнуўся неспадзеўны, нечаканы ратунак.

У вочы яму кінуўся, лежачы на паліцы, кот— вялікі, адгадаваны, мякінька-пушысты, як той заяц.

Адчайная думка застроміла кухару мазгі, і ён паманіў князёвага ката выстаўленымі пальцамі. Кот прыплюшчыў вочы зьмерыў постаць старшога кухара, важачы яго вартасьць у каціных вачох. Ад кухара прыемна пахла, вочы яго былі пакорна-ласкавыя, і кот патрошку, важна стаў падыходзіць да выстаўленых пальцаў. Як толькі ён даткнуўся іх сваёю гладкаю, шаўкаваю шэрсткаю, пальцы з дзікай зьнявагаю абхапілі яго карак і пацягнулі ў паветра. Кот захлынуўся ад шалёнай злосьці й крыўды. Абдумаўшыся, ён люта ашчэрыў зубы, заглабаў кіпцямі і закруціў хвастом; абраз князя стаў у выкачаных з галавы вочных яблыках і напаўняў кацінае серца зласьлівай радасьцю бясьсільнага, што во-

рагу князёвага ўлюбёнца будзе лютая кара за гэты зьдзек. Ды пальцы сьцягнулі яго карак мёртваю пятлёю і нясьлі ў брыдкім паветры. Калі дзьверы за людзьмі зашчапіліся на чэп, у вольнай руцэ кухара блiснуў вялізны, жудасны кухонны нож. Кот сабраў рэшткі сіл, сударажна ірвануўся і згубіў прытомнасьць. Гарачая кроў палілася з яго парэзанага горла, і наступіла вечнасьць.

У вадзін момант садраная скурка была кінута ў дальні кут пад печ, а чырвоны, тлусты, аблуплены катовы труп з адсечанай галавою, ляжаў, як добры, адменны заяц, на стале. Кухаравы рукі набраліся цьвёрдасьці, сэрца патроху сьціхла калаціцца, і кухарская праца закіпела. Час-да-часу кухар шаптаў „Вочча наш“, ксьціўся-маліўся, абціраў пот і маўкліва, старанна смажыў, перчыў, паліваў...

II

— Ой, сэрца, людцы!
Ой, сэрца!

Першы раз за ўсё жыцьцё еў князь і яго госьці такога смачнага зайца.—„Вось заяц—дык заяц!—хвалілі госьці:—пальчыкі аблізаць“. Князь прыемна ўхмыляўся і часам нават шкадаваў, нашто калісьці ў страшным гневе скалечыў кухара.—„Заяц добры, але і кухар мой нягоршы,—хваліўся ён: — граф Зібэр-Плятэр суліў мне летась за яго трыста злотых, ды я і за тысячу не аддам; мяркуйце, панове, самі: залатыя рукі, што?“.

Гутарка ўзьбілася на залатога кухара, і падвыпіўшыя госьці пажадалі паглядзець на яго. Паслалі гайдука ў пякарню, каб прывёў яго.

— Скуль яснавяльможны дастаў яго?—пытаўся граф Бжастоўскі.

— Мой падданы... тутэйшы. Ні ў Парыжы, ні ў Варшаве ня вучыўся,—мусіць з кухонным гэніем радзіўся.

— Што-ж так доўга не вядуць гэнія сюды?—запытаўся адзін пануры стары пан.

Князю не спадабаліся гэтыя словы, ён нахмурыўся і паслаў другога гайдука. Той ведаў князеў гнеў і памчаўся, як страла.

Тымчасам з кухарам рабілася няма ведама што. Першы пасланец, зьдзіўлены, ня ведаючы, што тут такое, стаяў над ім, старым, і ня мог даць рады, каб ён ішоў да князя.

Кухар зьбялеў, дрыжэў і не казаў ні слова. Ён глядзеў на пасланца вытрышчанымі вачыма і ня рушыўся з месца, быццам прыліпшы. Потым, урэшце, паволі скрануўся і пабрыў у сваю каморку, побач з прыкухоньнікам. Асунуўся там на калені, злажыў перад абразом рукі далонямі і скамянеў так. Не маліўся, ня кланяўся, толькі стаяў на каленях і глядзеў на абраз.

Доўга, можа, прастоіў-бы ён так, каб ня прыбег другі пасланы. Тады двое гайдукоў схапілі яго падпашкі і пацягнулі ў палац. Ногі яго ня йшлі, згібаліся, лоб узапрэў, зьмярцьвеласьць на твары не зьмяншалася.

— Упіўся ты з радасьці ці што?—крычаў на яго старшы гайдук.—Князь хоча пака-

заць цябе гасьцём, які ты, знацца, ёсьць штукар зайцоў смажыць, а ты й язык высалапіў. Ідзі ўжо сам!—і піхнуў яго зьлёгку ў бок.

Але кухар заваліўся на сьнег і ня йшоў. Потым ён схапіўся рукою за грудзі і балюча застагнаў: „Ай, людцы, сэрца, сэрца баліць!“

Гайдукі спалохаліся сапраўды, але ня важыліся і марудзіць і, схапіўшы яго, пацягнулі далей. З палацу выскачыў стольнік. Спытаўшыся на бягу, што такое, схапіў жменю сьнегу і пацёр кухару лоб. Тады ён трохі ачуняў і слаба паплёўся сам.

Калі гайдукі адчынілі дзьверы ядальнага пакою, паны голасна гаманілі, наперабой хвалячыся сваімі ўдачамі на ловах, рагаталі, строілі розныя жарты на свой панскі манер. Граф Бжастоўскі першы заўважыў і, сьмяючыся закрычаў: „Гэнія, гэнія, здаецца, прывялі!“

— А, вось ён гэній... —прабурчаў пануры стары пан і ўсьміхнуўся:—праўда, якісь асаблівы, быццам з таго сьвету... Але зайца смажыць мастак!

Госьці патроху сьціхлі і павярнулі галовы туды, дзе між двух рослых, здаровых, як дуб‘ё, гайдукоў, стаяў пахілены, зьбялелы кухар.

— Што табе зьдзеілася, дурню? Скажытка нам, як ты смажыў зайца?

Кухар толькі шавяліў васковымі вуснамі і нічога не казаў.

Князю было прыкра, што яго чалядзінец такі затуканы і баязьлівы.

— Што табе, дурню?—ізноў спытаўся ён грэблівым голасам;—чаго без пары спалохаўся: за добрую работу будзеш мець добрую заплату.

Кухар зразумеў гэта, як пагрозу, і асунуўся на каленькі.

— Князёчку! — залямантаваў ён, — харты яснай міласьці, харты, каб на іх паляруш!

Ніхто нічога не разумеў. Харты яго спалохалі ці што? Князь насупіўся, што кухар папсаваў яму добры гумар. Але ён не хацеў крута мяняць такую нядаўную ласку на гнеў і намерыўся яшчэ раз спытацца, у чым справа. Толькі ён тое падумаў, як кухар скруціўся і схапіўся абедзьвюма рукамі за грудзі.

— Ой, сэрца, людцы! Ой, сэрца!..

— З ім сардэчны прыпадак ад якогась перапуду,—сказаў пануры стары пан і стаў ліць у шклянку сьцюдзёнае вады, каб ратаваць няшчаснага; ён знаўся на лячэньні хвароб.—На, выпі, галубец,—прыклаў ён да зубоў кухара зазьвінеўшую шклянку і спрыюча, але жартам, дадаў: „Сардэчная хвароба—хвароба гэніяў“.

— Ой, людцы! Ой, людцы!—жаласна і брыдка лемантаваў кухар, скрабучы грудзі кіпцямі. Кавалак хлопу вылез у яго з вуха.

Усім зрабілася нялюба.

— Вядзеце яго!—загадаў князь гайдуком.— Хартоў спалохаўся, як дзіця...—прабурчэў ён усьлед падданаму і для супакою гасьцей зьвярнуўся голасна і, як нічога ня было: „Гэ-

та што—пара ласёў! Вось як мы летась палявалі з графам Зібэр-Плятэрам,—зуброў накрылі ў маёй дальняй пушчы...

І шумная лоўчая размова аднавілася. Забыліся і на зайца і на кухара.

III

Спачуцьцё шчасьлівага да няшчаснага сфальшывіла чыстую ў муках душу чалавека.

Хворы кухар стагнаў на ложку ў сваёй каморцы. Зьявіўся дворны фэльчар, даў выпіць супакойных капак, пытаўся, як сталася хвароба. Не дабіўшыся ніякага адказу, махнуў рукою і пашоў, Малодшыя кухары ад смутку і дзеля спачуцьця троху выпілі, сваім гоманам дурылі галаву хвораму, а тады пашлі й яны.

Позна ўвечары прыбег захныканы гайдучок Ясюк, шукаючы запрапашчонага ката. Ён, бедны, аблазіў усе куткі ў пякарні і нідзе яго не знашоў, толькі выцягнуў з-запечча зайчую скурачку, якая дужа нагадвала яму ката. З ёю ў руцэ прышоў ён да хворага, калі там нікога ўжо ня было, і стаў плакаць і жаліцца дзядзьку, што баіцца князя за ката.

— Можа ўцёк у лес... Можа сабакі разарвалі.. Заўтра яснавяльможны спытаецца, дзе кот... Што я скажу? Гу-гу-гу!—румзаў бедны хлопчык, прыпаўшы да скуркі тварам.—Вось ён такі быў гладзенькі, як зайчык... Прышоў са мною сюды ў пякарню, а потым ня ведаю, дзе дзеўся!

— Ня ведаеш, Ясюк? — узьняўся з ложка хворы і ўталопіўся на хлапца зьдзіўленым паглядам.—Ня ведаеш, дзе падзеўся твой... гэты... кот?!

— Ня ве-е-едаю-ю, гу-гу-гу,—не сунімаўся, плакаў Ясюк.—Можа ўцёк у лес ці на вёску, сабакі там мужыцкія разарвуць яго, гу-гу-гу...

— А ў пакоях ніхто ня ведае, дзе ён, халера, падзеўся?—аджыўся хворы кухар.

— Ніхто ня ведае, ня бачылі... ува ўсіх пытаўся. Што мне цяперака рабіць, дзядзечка... гу-гу гу! будуць сячы мяне, што не ўпільнаваў.

Сьмяротны цяжар раптам скаціўся з кухаравых плеч. Вялікім шчасьцем засьвяціліся змучаныя, праваленыя, з сінякамі ад сардэчнае хваробы вочы. Ком радасьці ўскалыхнуў збалелыя грудзі. Спачуцьцё шчасьлівага да няшчаснага сфальшывіла чыстую ў муках душу чалавека. З няшчырай пяшчотаю ўцалелага прыцягнуў кухар хлопчыка да сябе, прытуліў, гладзіў па галоўцы, жалеў, кажучы з найбольшай даступнай яму ласкавасьцю:

— Дзетка маё! Сіротачка мой бедны! Ня бойся, ня плач, неяк-жа абойдзецца. Ну, абсякуць, на тое-ж мы слугі панскія, каб нас секлі. Ня бойся, да сьмерці-ж не заб'юць. Во й мяне колькі разоў секлі,—нічога: неяк-жа мадзею... Супакойся, мой Ясючок, галубок мой! Здохні ён, кот! Можа яшчэ і знойдзецца, калі сабакі не разарвалі, вернецца, як захоча есьці, ліха яго ня возьме... Цябе князь любіць, можа й даруе, калі нават і згіне гэты падла.

Хлопчык, круглы сіротка, узяты з вёскі ў палац ад малых ґадоў, рэдка чуў такую бацькаўскую гутарку. Ён паволі змаўкаў, сьціха хліпаючы ня столькі ад гора, колькі ад расчуленасьці. Ласка старога кухара, які даў яму сёньня піражок, растапіла яго сэрца, як цяпло растаплівае воск. Хлопчык прыпаў да кухаравай рукі і пацалаваў... Скурка выпаўзла з яго далоні і скацілася на ложак. Кухар зорка сачыў за ёю і, упільнаваўшы зручнасьць, пасунуў локцем назад, і яна звалілася за ложак. Тады кухар пачаў умаўляць хлопчыка, каб ён ішоў класьціся спаць.

— А як-жа, дзядзька, хворы адзін будзеце ляжаць?—з дзяціным спрыяньнем спытаўся хлопчык, паглядзеўшы на старога чысьценькімі, абсохлымі ад сьлёз вочкамі.

— Нічога, Ясюк! Не шкадуй мяне, бо мне ўжо крышку лепей...

Прысяга

I

Цесна жыць на сьвеце!..

Дзеелася тое даўно, яшчэ за паншчынай. Разьвялося шмат цімакоў. Цімачылі ад паноў абы-куды: хто бег на Украіну, хто ўцякаў у вялікія месты, а хто басьцяўся па лясох.

Любіў залучаць цімацкі люд у глухія выселкі, дзе можна было прыбіцца да мужыкоў і жыць, хаваючыся ад начальства.

Забягалі вось так цімакі і ў Пнеўшчыну, невялічкія, убогія выселкі, дзе надта для іх мясьціна выгодная. Далёка навакол разьлягаецца пушча спрадвечная. Далёка да панскага двара і да ўсякага начальства, а якія дарогі ёсьць, то зусім малапраезныя. Такая глухамань, што ў вушшу заўсёды лес шуміць, дрэвы стогнуць і гамоняць. Уночы тут зьвярынае выцьцё і яшчэ нейкі невядомы рогат у лесе. А як сьціхне, здаецца, быццам сапраўды, ходзяць асілкі ў лясным гушчары,—вялікія з тое дрэва, але ціха шамаюць.

Узімку прыбылі ў Пнеўшчыну тры цімакі і прысталі ў парабкі к Тарасу, бо ён самы заможны гаспадар. Адзін цімак быў дзед, другі—

сярэднага веку мужчына, хворы, апохлы, а трэці—малады хлапец. Не пяршына была, што ў выселках цімакі хаваліся, аднак-жа гэтую тройцу Тарас надта неахвотна прымаў, быццам чуў бяду. Але дужа прасіліся гаротнікі, дык ён і згадзіўся ўзяць іх да сябе за здольнікаў.

Прышла вясна. Абжыліся троху цімакі, адпачнулі і з радасьцю віталі цяплейшы час. На сэрцы ў цімака заўсёды сьцюдзёная зіма, вось ён і рад усякаму цяплу і сьветласьці.

Сплылі ўжо астатнія крыгі па рацэ. Пагрымеў гром і пашчапаў пасохшую, трошку ліпкаватую зямельку на густое павучыньне, даўшы людцам знак, што і гараць пара. Хоць у полі, у аборках яшчэ поўна вады, але травяныя касьнікі пад ёй ля берагоў добра зазелянеліся. Над балотным купнікам, у веснавым паветры, з самае раніцы ўжо купаюцца шпаркія кігікаўкі з сваім нясьціханным крыклівадакучлівым: кі-гі! кі-гі! У лядзе-ж, сярод пнёў і леташняга карчэўя, забуяла тэй парою белая буквіца, бутоны сьвяжусенькія... Адылі і жоўтыя краскі зацьвілі. У полі яравым абыдзе і таўкачыкі расьлі. Лес папукаўся. Прыняліся людзі гараць.

Дзень згону ў нядзелю адбывалі панóм. Але на дворныя заворыны, хоць быў чацьвер, пагнаў войт усіх-чыста з Пнеўшчыны. Наўмысьля сам прыяжджаў, крычэў, што высялковыя зусім ад рук адбіліся, робяць толькі сабе,—сагнаў усіх і патурыў у двор. Паехаў і Тарас. А цімакі яго, пачакаўшы, пакуль

войт аддаліцца ад выселак, вылезьлі з гумна, дзе зазвычай хаваліся ў саломе, пасьнедалі і пашлі на поле рабіць гаспадару. За ўзгоркам, ля пушчы, каб на воку ня быць, завінуліся яны аблогу драць: дзед на кані з сахою, а тыя два з матыкамі ля пнёў.

Ціха і пуста навакол. Яны працуюць, а там яшчэ, за якія гоні, стары Яхім статак пільнуе. Болей няма нікога ў полі, усе на згоне ў панскім двары.

Прыемна йсьці за сахою па сьвежай баразёнцы, а злашча, калі побач лес зелянее першым ліпкім лісьцейкам. На дрэвах птушачкі пяюць, у балоце жабы квокчуць, сонейка-ж як прыгрэе, дык на лузе траўка прост пад вокам прабіваецца. Усё жывое парыцца і лезе ў гару да сонца. Падзьме ціхі, цёплы ветрык, і з вербалозу жоўценькі, як вуцяняткі, пух сыплецца. Хораша! Хораша! Шуміць зямля, але ціхусенька на сэрцы.

Хлапец скінуў шапку, потым сеў, разуўся і ўзяўся за працу лягчэйшы, басанож. Дзед зьехаў у нізінку, паклаў саху на бок, даў каню волю на траве, а сам дастаў піпку, выцягнуўшы босыя ногі на гладкай машастовай траўцы. Сярэдні тымчасам прыкрыў вочы далоняю проці сонца і глядзіць на поле, дзе-б напіцца. Аж раптам бачыць ён: бяжыць нехта з-пад хат угрунь і махае на ратаёў рукою...

— Гэй, Янка, падзівіся ты маладымі вачыма!—сказаў сярэдні цімак хлапцу голасна ад невядомае трывогі.

— Нам знакі падае!—адказаў той і крыкнуў трэцяму:—Дзядуль, глядзі, во!

Усхапіўся дзед, сышліся ўсе трое разам і глядзяць.

— Уцякаць трэба, вось яно што...—зразумеў стары з нудою на сэрцы.

А чалавек бяжыць, бяжыць па адхону з гары—то на іх махне, то на хаты аглядаецца.

— Тарас бяжыць,—пазнаў Янка.

— Адпрагайма!—крыкнуў таварышам дзядок.

Шпарка адкруцілі гужы, рассупонілі, а хлапец, перавярнуўшы, зьняў хамут. Пацягнулі саху ў кусты. Прыскочыў Тарас:

— Ну, бра-ткі... ха-ваў... пакуль можна... Уцякайце: прыехала равізія... Ловяць цімакоў...

Хапіўся за грудзі сярэдні, зьбялеў Янка, а дзед скрыгнуў зубмі. Трэба ўцякаць. Самі ня ведаюць, навошта адпрагалі, навошта саху ў лазу валаклі. І зноў хапіліся каня Тарасу запрагаць; з матыкамі ня ведаюць, што рабіць.

— Бяжыце, бяжыце, браточкі,—гоніць іх гаспадар:—сам рады дам.

Кінуліся і пабеглі, а ён пагнаў баразну.

Ледзьва пасьпелі схавацца ў лесе, як зазьвінелі балабонцы з-пад хат. Едзе на дрожках пан-афіцэр з казакамі. За ім цягнецца груд дзесяцкіх. Грымяць усе-чыста к беднаму Тарасу. А ён на свайго карага нокае, як надта ля працы завінуўшыся, а сам сабе думае: „Памажы, госпад бог, казаць усё так, каб да праўды падобна хоць троху было“...

Раптам і абсох. Аж захаладзеў.

Пад‘ехалі.

— Гэй!—крыкнуў Тарасу пан яшчэ здалёк, ды той і так ужо стаяў; скінуў шапку і бяжыць насустрач у руку цалаваць.

— Памажы, божа!—пасьмеў нехта з дзесяцкіх сказаць ратаю на яго працу. Сказаў і застыдаўся свайго голасу.

— Цімакоў хаваеш,—га?!—грозна крыкнуў пан, яшчэ седзячы на дрожках.

— Не, вашмосьць, я не хаваю...—заплюскаў вачыма Тарас і кінуўся прад ім на калені.

— Брэшаш, псякрэў твоя! Вяжы яго!

-- Пане! Яснавяльможны пане...—ня ведаў, што тут казаці, Тарас. Не чакаў, што гэтак зьнецяйку схопяць яго.—Зьмілуйся, паночак залаценькі. . родненькі... божжа-ж мой, божжухна!..

— Ціха!!

Толькі костачкі затрэскалі, як скруцілі яму рукі за сьпіною і зьвязалі яго вяроўкаю. Тады начальнік зьлез. Грубенькі і кароценкі, чырвоны, як яблычка, бліскаючы гузікамі, падышоў ён к Тарасу і тыцнуў пад нос кулаком у пяршчатцы. Уеўся вачыма ў безабароннага чалавека, памаўчаў, набраў ў грудзі паветра ды як рыкне:

— У Сібіры згніеш! Здохнеш, як пес, лятачкі! Хаваеш панскіх цімакоў! Дзе яны, га! Кажы... дух з цябе выпру!!!

Схапіў Тараса абедзьвюма рукамі за грудзі і калоціць на ўсю сілу. Маўчыць Тарас.

— Нічога ня ведаю... Нічога не скажу...— гэтак часам прашэпча, але ізноў маўчыць, толькі галава барадатая баўтаецца, як той зачне трасьці.

— А, так! Добра-ж!—кінуў урэшце пан; —добра-ж,—кажа,—пабачым, як-то ты ня ведаеш. Марш назад!

Скамандаваў, сеў на дрожкі, і ўсе ізноў пасыпалі за ім, пасунулі да хат.

„Не, не скажу, нізашта не скажу“, разважаў на дарозе Тарас: „хоць да сьмерці хай заб'юць, але ня прызнаюся“. Як так падумаў, то й на сэрцы весялей зрабілася.

Тымчасам прыехалі на вуліцу і сталі наўпроці Тарасавае хаты. Там ужо сабралася троху людзей; сярод баб і дзяцей выла і кідалася Тарасіха з сваім малым на ўлоньні, але-ж яе хапалі за рукі і гэтак ня пушчалі. Зараз прыцягнулі на вуліцу вялікі зэдаль і побач з ім паставілі начоўкі з мочаным бярозавым гальлём. Відаць, ужо раней аб гэтым паклапаціліся, пакуль вялі арыштованага з поля. Як убачыў бедны Тарас, што яму рыхтуецца, аж задрыжэў і рукі, ногі памлелі, хацеў нешта сказаць, дык язык не варочаецца. Прыхінуўся, зьвязаны, да хаты. І сьвет быў ня міл, хоць сонейка сьвяціла. Меліся ўжо пачынаць, але начальнік стаў штосьць марудзіць, задумаўся. Народ і казакі ўзіраліся на пана, ня ведаючы, аб чым так замаркоціўся.

Тады ён дастаў з кішэні кавалак паперыны і алавік, сеў на прызбу і на калене напісаў запіску. Паклікаў наківы аднаго казака і сказаў, аддаючы цадулку:

— За гадзіну вярніся мне з папом.

Скочыў казак на каня, перавёў яго з размаху нагаём і закурыўся пылам-дымам, як шалёны.

Усе толькі думаюць, што гэта дзеецца.

А Тарас, з замлелымі рукамі, спусьціўшы галаву, стаяў засмучоны і паважны, як быццам незацікаўлены. Толькі часам мімаволі дрыжэла ў яго нешта на шчацэ, калі з хаты вылятала жонкіна і дзяцінае выцьцё і галасы дзесяцкіх; яны там то наўмысьля голасна крычэлі на бабу, то ціха, з пачуцьцём гаварылі з ёю.

Пан-афіцэр сядзеў на прызьбе, паліў цыгару і часамі ўсьмяхаўся сам сабе ў вусы. Адылі пачаў пісаць на прынесенай з гумна калодцы пратакол. Дзесяцкія расклалі на бярвеньні свае хатылькі і елі хлеб з сольлю. Час цягнуўся надта доўга.

II

> Цяжка вырвацца з
> лапцугоў цямноты!

Затарарахала ў канцы вуліцы брычка, і ўсе паглядзелі туды. Ехаў верхам казак-пасланец, а сьледам за ім на брычцы старэнькі поп. Зашавяліўся народ,—троху з палягчэньнем, што ўжо годзе чакаць, а найболей з трывогаю і няведаньнем. Калі сівенькі войчанька ў чорнай старой расцы ўвашоў у хату і зашуршэў па зямлі скурацянымі лапцікамі, а казак нёс за ім клунак з царкоўнымі паратамі,— тады сярод людзей павісла важкае чуцьцё незьясьнёнае нуды. Абраз гэты нагадваў ім хаўтуры.

Афіцэр аб нечым пашаптаўся з сьвяшчэньнікам. Шмат хто з мужчын заўважыў, як вой-

чанька няпрыемна ўразіўся і намагаўся схаваць тую прыкрасьць у сваіх глыбокіх, запалых вачох.

„Прысяга... прысяга“... пашло хадзіць страшнае слова па людзёх.

— А кадзіла не забыліся ўзяць?—з цікаўнасьцю зьвярнуўся пан да казака, калі той разьвінуў на лаўцы клунак.

— Так точна, вашскародзь, узялі,—адказаў казак.

— Кадзіла я прывёз, пане начальнік, бо гэтак напісалі, але яно тут не патрэбна,—мякка сказаў сьвяшчэньнік афіцэру.

— Хай будзе, хай будзе!—запярэчыў яму пан, а нахіліўшыся дадаў на вуха:—гэта ім для ўражаньня.

Казакі высунулі стол на пасяродак хаты і накрылі яго чорным сукном. Соцкі падышоў з кадзілам к печы, выняў заслонку, выкаціў чапялою колькі вугалёў дый, абхухаўшы ад попелу, насыпаў іх у кадзіла і падаў яго сьвяшчэньніку. Той дастаў з кішэні ладану і сыпнуў на вугалі. Соцкі аддаліўся йзноў у парог і пачаў дзьмуць, бразгаючы ланцужкамі. Прыемны, але хаўтурны дымок расплываўся па хаце і кіраваў людзей на пакутныя думкі. Хто шавяліўся, хто заціх ад нейкага страху. Тарас зьбялеў, як крэйда, і глыбока дыхаў. Усялякія думкі роіліся ў галаве. Кавалкі ўспамінаў, абломкі абразоў зьбіваліся ў нейкі балючы груд, у нейкі прыкры, беспарадачны громазд. Давілі галаву. Ня было яснасьці. Нешта карціла. Як зрабіць: так ці гэтак? Што такое? У чым справа?

Станавіліся ў ваччу цімакі...

Увечары, калі ўсе людцы, павячэраўшы, спаць клаліся, калі з цёмнага поля плыў з веснавым ветрыкам арамат сьвежае зямліцы, калі жабы квохалі і кумкалі, як п'яныя, ад салодкасьці, тады стары цімак цішком выхадзіў у сад пад яблынку крывую, кідаўся на калені, вачыма на ўсход, сашчэпліваў рукі і маліўся—краіў свае беднае сэрца. Маўчала і цямнела прыгожае веснавое неба, і дзядок, як зьвер, драпаў свае худыя, валасатыя грудзі. Падгледзіў тое маленьне Тарас і ня раз бачыў яго ды нікому нічога не казаў, бо хто гэтага ня ведае ці не разумее?

Сярэдні ў такі час ніяк ня мог заснуць і варочаўся на палацях, то кашляў, то сьціха ўздыхаў. Ня любіла Тарасіха, што ён крэкча; а то яшчэ зьлезе з палацяў і пачне ўпоцемку шукаць карца на судніку, мацае, стукае, часам аберне што,—смага яго мучае.

А хлопец-цімак сядзіць, бывала, на вуліцы да позная пары і ўсё на дудках адну песьню граець а граець.

Усё тое станавілася Тарасу ў ваччу.

А ўжо налажыў на сябе войчанька эпітрахіль, узяў крыж у рукі, крэкнуў, агледзіў людзей у хаце і пачаў казаць:

— Брація ў хрысьце! Клясьціся страшна. А клясьціся імем самога бога, клясьціся перад яго сьвятым лікам, гэта... гэта... прысягацца, браткі, яшчэ страшней. Ня дай божа прысягацца бяз пільнае патрэбы ані вам, ані дзеткам вашым.

— Ды яшчэ найстрашней тое, што назваць і то язык мой не паварачваецца, гэта—прысяга няпраўдзівая... Найцяжэйшы, сьмяротны грэх, загуба душы і цела на гэтым і на тым сьвеце! Крый нас, божа, засьцеражы, забарані! Знацца, чалавек калі ён фальшыва прысягае, то быццам гаворыць сабе і людзям: „Вось я не баюся бога і стаўлюся з ім уроўні, як той дыпраклятьі сатана“. Госпад бог за гэтакую дыябальскую гарэзасьць зьніштажае, сьцірае з твару зямлі, як нягодную пылінку. Бо гэта, браткі, ёсьць ашуканьне стварыцеля, юдзінае цалаваньне. І за няпраўдзівую прысягу,—ці-ж вы ня ведаеце,—бог карае чалавека яшчэ на гэтым сьвеце. Спамяніце, як загубіў сваю грэшную душу нябожчык Тодар Бычанок. За фальшывае прысяганьне ён асьлеп, а ўсе яго дзеткі няшчасныя паўміралі ў адзін год. А Клім Тамашонак? Здох у яго конь і карова, і сам уцалеў толькі за тое, што шчыра пакаяўся народу ў фальшывай кляцьбе. Брація! Страшна гэта, страшна, страшна!..

Скончыў войчанька, і тады пан-афіцэр дадаў гэтак:

— Чуеце, хлопы! Тарас упэўнівае, што цімакоў у яго няма, што ён іх не хаваў і што са згону ўцёк так сабе, няма ведама чаго. Дык вось, яшчэ ён мае час прызнацца. А не захоча,—хай прысягне і чакае кары боскай!

Усе зірнулі на Тараса.

На лобе ў яго заблішчэў драбнюсенькі пот. Вочы, як утупіў, так і не падняў. Маўчаў, быццам занямеўшы. З закручанымі назад ру-

камі слабеў, слабеў, хіліў голаў і плечы. Хто-б даў веры, што за пару гадзін так саслабне дужы мужчына?

— Разьвяжыце яго!

Страшное, напруджаннае і ад сьвядомасьці, што ня доўга так хістацца, адчайнае змаганьне ахапіла земляроба. Ня ведаў, што тут грэх і што ня грэх.

— Не прысягай, браце!—шапнуў яму дзесяцкі, адкруціўшы з рук вяроўку.

І паляцела сэрца ў чалавека ўніз, уніз, якбы няма зямлі пад нагамі.—„Прызнаюся!“— падумаў і рашыўся.

У гэты міг нейкі другі дзесяцкі пільна паглядзеў яму ў вочы і нічагутка не сказаў.

І замоўчыў Тарас. З туманам у вачч у падняўшы для прысягі руку, падыходзіў к сталу, да чорнага сукна з мэталічным раскрыжованым богам і сьвятою кнігаю ў бліскучай цьвёрдай вокладцы. І неўспадзеўкі скапыціўся і ледзь не заваліўся: аборына раскруцілася на назе, і ён другой нагою ступіў на яе канец.

— Скажу!—раптам прашавяліў ён вуснамі, але спазьніўся: не пачуў яго ніхто, а войчанька сівы завёў ужо тое, што належыцца. Прысяга пачалася.

Прыціхла і пакарылася Тарасава душа.

Маўкліва стаялі цёмныя людцы. Скрозь адчыненае акно дыхаў цёплы вясновы ветрык, і верабейка ціўкаў на страсе. Сонейка, як заўсёды, гуляла на балонках. На падворку круціліся і порскалі ў саломцы парасяткі, а ля іх бяз клопату хадзілі куры.

III

Лепей пакланіцца ды ўцячы...

Так прысягнуў Тарас.

Увечары, калі ўсё троху супакоілася, прышлі з лесу цімакі. Даведаўшыся аб усім, пакланіліся яны ў ногі чалавеку, ды не пасьмелі паглядзець яму ў вочы.

— Што-ж, браткі, заставайцеся надалей,— казаў непаслухмяным языком да іх Тарас,— жывеце, бо цяпер-жа ўсё роўна...

Ніякага адказу не далі на тое цімакі,—ні дзед, ні хлопец, ні сярэдні. Маўкліва пазьбіралі сваё ўбогае рызьзё, насунулі на плечы хатылі і пацімачылі скрозь цёмну ноч па глухой пушчы, у дальшы сьвет. Было ім часам жудка. Здавалася, што ззаду стаяць вочы... А ў тых вачох—боская кара за прысягу. І ўцякалі нешчасьлівыя ад яшчэ болей нешчасьлівага...

Уцякалі, спавітыя спрадвечнаю цямнотаю, спрадвечнымі забабонамі, вызваліцца ад якіх яшчэ ня мелі сілы...

Страшная музыкава песьня

Дзеелася тое за прыгонам.

Быў у таго пана, акрутнага і злога пана Дастаеўскага, малады музыка.

Звалі яго—Арцём Скамарох.

Затое—Скамарох, што ўвесь род іх—скамарохі. Бацька, дзед і прадзед умелі йграць на скрыпцы і былі скамарохамі для ўсяе акругі.

Ніводнае вясельле бяз іх не абышлося.

Спачатку дзед іграў, даючы прыклады сыну. Потым бацька замяніў, водзячы з сабою па йгрышчах і кірмашах, дзе трэба і ня трэба, свайго малога Арцёмку.

Але вось памёр дзед, памёр і бацька з маткаю. Застаўся дзяцюк адзін, сірота. Тады пан Дастаеўскі ўзяў яго да сабе ў двор.

Іграць-жа хлопец умеў так, што бацьку й дзеда перашоў. Ня простыя дастаў ад долі пальцы.

Ды толькі меў і свае гонары Арцём. Вядома, наш брат-мужык, панскі падданы, а ў ім гонар быў зусім нянаскі.

Такі ганарлівы быў хлапец, што нават пан сьцярогся рабіць яму якую крыўду. Такі ганарлівы: як не захоча йграць, то ці ўпрашай яго, ці пагражай яму,—ня стане йграць дый годзе!

І вось аднойчы прывёз пан Дастаеўскі з Аршавы новую палюбоўніцу-палячку.

Палячка тая вазьмі дый улюбіся ў нашага музыку.

Узяла на вока простага дзяцюка.

Каб ня быў такі ганарлівы, то рэч у той мінулы час звычайная. Пан бавіцца з палюбоўніцай, а палюбоўніца яшчэ каго ў сэрцы мае.

Аж тут вышла цэлая гісторыя. Арцём дзяцюк быў гэткі: як ня любіў, то й прыкідацца не хацеў...

Выедзе пан Дастаеўскі да Аршавы або ў госьці да суседзяў, або на ловы ў пушчу,— палячка толькі таго й чакае. Гукнець мальца да сябе і просіць, каб ён іграў.

Пакуль Арцём ня ведаў, у чым справа, іграў палячцы розныя наскія песьні, да якіх мела яна вялікую цікавасьць, бо ніколі раней ня чула іх. Нават гаманіць панаску трохі нялася, каб, знацца, лягчэй апанаваць яго.

Але, як зразумеў музыка, што ня простым вокам глядзіць на яго панская палюбоўніца, што не здарма распушчае перад ім свае даўжэнныя, чарнюсенькія, быццам вугальле, косы, што ня так сабе хмурыць свае бровы, што не абы-чаго ў яе на бел-румяным твары якоесь нецярплівае, капрыснае ламаньне,—як заўважыў усё гэта, страціў ахвоту іграць ёй песьні.

А дзяўчына бачыць, што хлопец ганарлівы,—і пэўнасьць страціла сваю.

Вядома, як жанчына страціць пэўнасьць, то робіцца як-бы якая няпрытомная. То плача, то сьмяецца, то злуе-халяруе, нічога ў сьвеце ёй тады ўжо не смакуе, і кожны лёгка заўважыць яе каханьне.

Палячка была з людзьмі абыходлівая і шмат хто шкадаваў яе, бо ведама-ж: і ў панскай палюбоўніцы ёсьць чалавечае сэрца, і яна-ж на сваім хлебе—чалавек.

Шкадуюць людзі палячку, нарікаюць на Арцёма за ганарлівую натуру.

А музыцы нашаму дадзела тое горш за рэдзьку. І сам ён шкадаваў прыгожую палячку, ды раз на злосьць усім сказаў камусьці гэтак: „Не хачу за панам падбіраць... Няхай яна сабе другога пашукае!“

Злыя людзі вазьмі і дакажы палячцы.

От-жа вышла гісторыя, зусім, як у тэй біблії аб Язэпе тым Прыгожым і начальнікавай жонцы.

Прыехаў пан, палячка з роспачы й назводзіла яму на беднага музыку. — „Так і так, кажа, „лез гэты хамуйла да мае красы“.

Але пан сьцяміў, што справа, мабыць, трохі іначай выглядае.

Гукнуў ён да сябе Арцёма, запёрся з ім вока-на-вока ў габінэце і ну яго пытаць:

— Скажы, хаме, чым ты прывабіў да сябе маю палячку?

Маўчыць Арцём. І што тут скажаш?

— Хочаш ты, хаме, з ёю ажаніцца?—ізноў пытаецца ў яго пан.

— Нізашта ў сьвеце, найласкавейшы пане:—цьвёрда адказвае Арцём.

— Цо- ж я бэнда з вамі робіл?—як-бы раіцца з ім пан;—іграў ты ёй хамскія песьні?

— Іграў, паночку!

— То выбірай, галгане: або жаніся з ёю і сядай на хлопскую там гаспадарку, або маеш іграць ёй што хоцькі... адну ноч?

— Жаніцца, ніколі не жанюся, а йграць— на тое мне і пальцы служаць.

— Добжэ мувіш, хаме,—пасьміхнуўся пан,— паментай-жэ о тэм!

А за колькі дзён зъдзеелася неспадзейнае няшчасьце: захварэла палячка і памёрла...

Мабыць, паднёс атруты пан.

Прыбралі яе на той сьвет у багатыя панскія ўборы, паклалі ў вялікай салі на чорны стол, запалілі сьвечкі...

Наступіла ноч, кліча пан музыку з іскрыпкаю.

— Паменташ, хаме, цо мне мувіл?

— Памятаю, найласкавейшы пане.

— Ну, то йдзі іграй цэлую ночку нябожчыцы, каб яе душа ня вельмі сумавала па гэтым марным сьвеце...

Спалохаўся наш музыка, думае: жартуе пан... Не!

— Ідзі, ідзі,—кажа,—галгане, такая-ж была ў нас умова.

Пашоў Арцём у салю, і зачынілі яго там аднаго з палячкаю.

Жудасьць ахапіла людзей, вялікі жаль мелі да музыкі і баяліся, што ў тэй салі пры нябожчыцы прышла-ткі на яго загуба.

Спаміналі цяпер розныя страшныя пераказы: як уставалі памершыя з труны, каб загубіць таго, каго ў жыцьці дужа любілі.

Сталі нават шаптаць, што палячка была чараўніца; старая кракаўская ведзьма, якая

ўдалася прыгожай панскай палюбоўніцай, каб загубіць нашага музыку.

Казалі нават, што і сам пан Дастаеўскі спутаўся з чартамі, якім даўно карціла зьвесьці з сьвету слаўнага музыку. Вядома, чарцям няма спакою ад добрага музыкі, бо ён сваім харошым граньнем робіць людзей лепшымі, верне іх на добрыя думкі.

А было ўсё гэта пад канец лета, калі з надыходам восені наступае самая вядзьмацкая пара.

Што-ж тымчасам рабіў Арцём?

Прышоў ён да труны, памаліўся за ўмершую душу і ўзяўся настрайваць сваю старую скрыпку.

Тады адчыніў напята акно і даў першы гук на струнах...

Як нейкі боль, як нейкі стогн раздаўся гук у садзе, сярод адцьвіўшых красак, сярод агорнутых цішою ночкі дрэў, пачуўся ён у сэрцах панскай чэлядзі і даляцеў да пана, што сядзеў у габінэце пры чарцы старога віна.

Усё прыслухала: што будзе граць музыка нябожчыцы на разьвітаньне?

Памаўчаў трохі музыка і паволі, сьціха, маркотна заіграў „Вечную памяць“.

Дужэлі гукі, расьлі, і вось здавалася, што цэлы хор папоў адпявае чалавека.

Яшчэ дужэйшымі рабіліся гукі, і дзіўна было ведаць, што там усяго толькі адна скрыпка так пяе...

Ня хор папоў пяяў там, а быццам тысячы панурых галасоў зьліліся ў адным хаўтурным гімне.

Слухаючым тую песьню, жаль было марнай чалавечай долі, мізэрнымі былі раскошы гэтага сьвету, нікчэмнымі нашыя сваркі й звадкі: „Суета сует и всяческая суета“, „Прах еси и прахом отыдеши,“—пяялася ў тэй песьні.

Але скончыў музыка маліцца, памаўчаў трохі і зайграў штось іншае. Трудна было адразу ўхапіць, аб чым гаворыць яго скрыпка, але чулася нешта знаёмае, даўна вядомае, даўна перажытае. Як-бы там лес шуміць, якбы завіруха ў полі гудзіць, ізноў-жа як-бы жнеі пяюць. Зайграў, значыцца, музыка аб штодзённым жыцьці чалавека. Кашаль б‘е старога дзеда, гоман якісь людзкі, як-бы сварка бабская, кугаканьне дзяцінае... І такое выразнае, дарма што скрыпка, быццам сапраўды хворая ці галоднае дзіцятка заходзіцца. Так плача, так плача, што вытрываць аж трудна, хочацца бегчы да яго, каб суняць тое плаканьне. І чуецца, што сунімае матка: „А-а, а-а, малое! а-а, а-а, беднае“! Патрошку сьціхае дзіця, калыша яго матка, скрыпаюць пачопкі цераз даўгую ночачку, скрыпаюць і скрыпаюць, як-бы вось тут во, каля цябе, дарма што гэта, адно, скрыпка даказвае пад музыкавымі пальцамі. Звычайныя песьні граў музыка, але слухаў-бы яго, слухаў без канца-краю.

Ня плач, маё дзіцятка, а цыц маё родна.
Вунь там войт ідзець,
На татку, на мамку ён бізун нясець,
У тым у бізуне скураты увіты,
На тым на бізуне сьлёзкі паліты...

І шмат чаго іграў музыка аб сваёй нядолі, змалку дзён.

А так, песьня за песьняй, сыйграў усё жыцьцё сваё.

Цёмная ноч стаяла на дварэ, а як іграў, то быццам расплывалася цямнота: то жніво перад вачмі, жнеі пяюць, то ў сенажацях косы звоняць, то ў супрадках вераценцы трынкаюць, то на ігрышчы лявоніху хлопцы з дзеўкамі скачуць.

І нікому не здавалася дзіўным, што ля труны нябожчыцы іграець ён ня толькі хаўтурнае, але й штодзённае, бо ўсё пакаралася пальцам музыкавым; усё было толькі хараша, ці яно сьвятое, ці грэшнае.

Аж так і да паўночы падышло.

Дашоў музыка да тае нешчасьлівае часіны, як іграў палячцы наскія песьні.

Трубіць паляўнічы рог, гаўкаюць ганчакі,— гэта, значыцца, выяжджае пан на ловы.

Сьмяецца палячка, як-бы званочак сярэбраны,—гэта яна цешыцца, что Арцём да яе ідзець. Пакацілася ад скрыпкі смутная жніўная песьня, гэта ён пачаў іграць ёй наскія песьні.

Песьню за песьняй іграе скрыпка, і такая жальба, такая жуда чалавечае душы была ў тым граньні, што сэрца ад болю ўсім сьціскалася, белы сьвет ня мілы рабіўся, жадалася чагось няведамага, чаму ніколі на сьвеце ня бываць. Разьліваецца ў сьлёзах скрыпка, плача аб марнасьці таго сьвету, дзе адзін любіць, а другі—не. Так іграў.

Але вось перабіваецца іграньне на новы тон. Выплывае на паверх магутны гук, горды, непераможны, пад якім ледзьве чуваць і тыя песьні жніўныя, і тое мучаньне палячкіна. Зайграў Арцём аб сваёй гордай, адзінокай душы, зайграў аб сваёй музыцы. Грыміць няземны гімн, аж увесь сьвет ад тых гукаў дрыжыць... Па-над усім вышэй стаіць музыкаў гімн, няма той сілы ў сьвеце, якая-б яго сходала.

Раптам зарагатала з габінэту панскага нешта нялюдзкае дзікое... Пан рагоча, вые, сьмяецца! А музыкаў гімн, не зважаючы, плыве шырокай хваляю ў паветры цёмнае начы, як тая магутная бурлівая рака ў павадкі.

Сьціхла рагатаньне, і сярод музыкі раптоўна: бух!..

Сьціхла й музыка. Бягуць людцы да пана ў габінэт, глядзяць: аж ён ляжыць з разьбітымі мазгамі, пісталет турэцкі пры ім уронены ляжыць.

Здужала яго нячыстую сілу Арцёмава іграньне,—застрэліўся наш пан!

Пахавалі яго з палячкаю разам, Арцёма-ж болей мы ня бачылі: сышоў ад нас у сьвет, няведама куды.

Вось які быў калісь музыка, вось якое-што часам дзеялася за прыгонам.

Стары профэсар

Дзеялася тое дужа даўно..

Прыяжджаў некалісь да пані ў госьці стары профэсар з маладою жонкаю, панінай пляменьніцай.

Прыехалі яны аднаго разу з Пецярбургу на папраўку познаю вясною, калі ўжо адпяялі салавейкі і адцьвілі акацыі.

Ды яшчэ прыгожа было ў панскім садзе, і кожны вечар, ідучы з работы міма сіняга плоту, можна было бачыць там на сьцежцы беленькую сукеначку ў пары з вялікаю чорнаю постацьцю профэсара.

Надта-ж любіў гэты паджылы вучоны чалавек сваю невялічкую рухавенькую жонку. Ён высокі, маўклівы, а яна ўчэпіцца за яго локаць, шчабеча яму, як тая птушачка, заглядае зьнізу ў вочы, як дачушка да старога бацькі.

Відаць, што ён ня можа на яе налюбавацца, як-бы дзеля таго й маўчыць. Пазірае з вялікаю пяшчотаю і толькі носам усьміхнецца да яе з радасьці, як дзіця.

Затое і ўсіх людзей любіў. Да сялян быў ласкавы, даступны, сам падходзіў і пытаўся аб іхняе жыцьцё. І любіў слухаць усё, што яму кажуць. Песьні і казкі любіў, як нет ве-

дама што. Пачуе цікаўную казку ад пастуха Якіма і ходзіць за ім, пільнуе, каб яшчэ пачуць. Пачне той плясьці свае плёткі, а профэсар слухае так, як-бы богу моліцца, слоўца не прапусьціць. Як той скончыць, ён задумаецца, засмуціцца, а потым і ўсьміхнецца пасвойму, як тое дзіця. Пачуе дзявочыя песьні, і ўзноў яму вялікая радасьць.

Палюбіў народ і яго жонку. Нават да старой пані ў тым леце ўсе ласкавейшыя за іх зрабіліся.

Дык ня дзіва, што надта ўсім было жалосна, калі захварэла маладзенькая паня на якуюсь цяжкую і цягучую хваробу.

Як прышло жніва, не бялелася ўвечары сукеначка між дрэў у садзе, затое бесьпярач стаяла ля сіняга плоту карэта пад доктара. То завазіла, то прывазіла, а палёгкі ніякае няма. Перабывалі з гораду ўсе дактары, то езьдзіў адзін, то потым другі, а, урэшце, і ўсе разам, тры ці чатыры сабраліся, а рады ня могуць даць ніякай.

Схудзеў профэсар, аблахмаціўся, вочы ў яго ўваліліся, гаруе бедны, як ня плача пры людзёх. Лячыў, лячыў дактарамі і прычакаў таго, што ўсе дактары ў адзін голас зусім яго абезнадзеілі. Хоць нічога яму страшнога не казалі, але відаць па іх, што чакаюць канца і як бы дзівяцца, чаму хворая так доўга не даецца сьмерці.

Хадзілі да яго і нашы бабы-шаптухі з сваімі радамі, ды ён і слухаць іх не хацеў, нават з старою паняю за іх пасварыўся. Ня ўцям

гэта было людзём: казкі-ж простыя слухаць любіў, чаму-ж, думалі, ня хоча спрабаваць простыя рады? Бывае-ж—памагае.

Тымчасам адбіў ён тэлеграму у Пецярбург найлепшаму доктару. Прыехаў якраз на самага спаса. Пастукаў, паслухаў, паківаў галавою, як перακазвала пакаёўка, ды і разьвёў рукамі таксама, як і тутэйшыя дактары: няма надзеі. Купіў у Хаіма-рандатара пяць пудоў раньніх мядунічак з панскага саду і паехаў назад у Пецярбург.

Хворая ссохла, зьбялела, зьнядужала ў канец: адны косьці, абцягнутыя тоненькаю скураю. І што ёй такое было, хто ведае: то гарачка паліць, як агнём, за сорак градусаў даходзіць, то асьцюдзянее ўся, аслабне і так самлее, што вось-вось сканае нешчасьлівая... Разоў колькі думалі, што й памірае... Старая паня ламае з гора рукі, лемянтуе, хапае ў пакаёўкі сьмяротную сьвечку, прыступаецца да пляменьніцы на вечнае разьвітаньне, пакаёўка й кухарка равуць ад жалосьці, а профэсар, забыўшыся на сваю вучонасьць, крычыць на іх усіх, гоніць вон, потым абхопіць хворую, сашчэпіць у сваіх абоймах, прытуліць да яе пасохшых грудзей сваю сівую галаву і шэпча, як здурнеўшы: „Не, не, не! Гэтага быць ня можа! Ты не памрэш! Ты не памрэш! Я хачу, каб ты жыла. Мы ўзноў будзем гуляць вечарамі ў садзе... Мы ўзноў будзем гаманіць... А то не, мы кінем гэтае гіблае месца! Мы паедзем у Пецярбург! Паедзем, паедзем... Чуеш, рыбка мая, я не хачу, каб ты памёрла, ты не

памрэш, не! не!! не!!!“ А ў самога вочы гарэць, барада трасецца. І хворая, быццам паслухаўшы яго, патроху кранець вачыма, пачне дыхаць. І так гэта ўсё жаласна, што глядзець,— сэрца кожнаму сьціскаецца болем.

Пакаёўка, Аўгеньня, была сірата і мела толькі аднаго дзядзьку, таго самага пастуха-Якіма, што, бывала, пану казкі плёў і так складаў розныя нябыліцы. Яна часам бегала да дзядзькі пагаманіць і, вядома, пераказвала, што дзеецца ў панскім будынку. Жаль было Якіму добрага профэсара і яго маладой жонкі. І параіў ён, каб сказала паном зрабіць так: абвязаць хворую сырою ніткаю і кінуць тую нітку на раздарожжы, каб зьняла хваробу. Аўгеньня, вядома, дзяўчына, не сказала старой пані з вока-на-вока, а бухнула ў сталовай за абедам, калі быў і профэсар. Старая пані і абедаць кінула, хоць якое там з гора і абеданьне было! Пасядзяць моўчкі за сталом, цяжка ўздыхаючы, паглядзяць са смуткам на стравы і пойдуць, нічога ня зьеўшы.

— Зрабіце так, зрабіце пан профэсар! — кажа старая: — зрабіце, калі вам дорага мая Вольгачка.

А Вольгаю звалі хворую.

Профэсар за час хваробы жонкі зрабіўся апрысклівы, гняўлівы...

І тут загневаўся:

— Я чалавек навучны, а вы мне дурніну такую кажаце.

— Пабойцеся вы бога, пане профэсар, з сваёю навукаю, — аж дрыжыць і сьлёзы абці-

рае старая паня: — што вам даражэй: ваша навука ці... ці... жыцьцё... жыцьцё Вольгачкі?..

І вось профэсар паказаў сваё каменнае навучнае сэрца. Гаворыць так:

— Навука сказала сваё слова, і я веру ёй, а ня вашым забабонам.

Паня й Аўгеньня аж вочы ў страсе на яго вытрышчылі. І ён, мабыць, сам спалохаўся таго, што сказаў. Затросься ўвесь, застучэў кулаком па стале, закрычэў, як не ў памяці:

— Веру, веру, веру! Але не хачу гэтага, не хачу, не хачу, ой не хачу! — Потым схапіўся рукою за горла, завыў і бразнуўся на стул. Адлілі яго вадою, валяр'янавых капак выпіць далі, пагразілі, што хворая пачуець яго крык. На тым размова скончылася.

Тую ноч была радоўка пільнаваць хворае профэсару з Аўгеньняю, бо так хворая настоіла, каб адну ноч старая паня з кухаркаю, а другую ноч яны-б былі пры ёй. Толькі ўсё роўна профэсар што ночы амаль не адхадзіў ад яе ложка, адно што не ў сваю радоўку стараўся ня быць на ваччу ў хворае і сядзеў у сумежным пакоі.

К гэтай ночы хворая зусім струхлела. Гарачка адпусьціла бедную, дык ляжала выцягнуўшыся, як доўгі шкілет, сіняя, непарушная.

Цеміць профэсар, што сьмерць у пакой увашла. Цеміць і з галавы сходзіць. Сатнець зубы, абхопіць галаву рукамі і сядзіць, пахінуўшыся да кален, у крэсьле.

Калі хворая задрамала трошкі, вышаў ён на мысічках у другі пакой і давай штосьці шаптаць.

Прыслухаецца Аўгеньня і чуе, што ён спамінае ўсё то жонку, то навуку.

Расчыніў акно, глядзіць у сад і ўсё шэпча сам з сабою.

Жніўныя ночы ў нас дужа прыгожыя, асабліва як дзе дрэвы лісточкамі ў цемні варушаць. Цёпла, ціха, там-сям зорачка блісьне, з поля, дзе жыта пажатае, прыемны супакой так і плывець у душу. І антонаўкамі прыемна пахне...

— Сьпіць?—шэптам спытаўся профэсар у Аўгеньні і, убачыўшы, як кіўнула галавою, вышаў у сад—прахаладзіцца ці хто-ж яго ведае чаго.—Каб яшчэ не зрабіў сабе ад гора чаго ліхога", памысьліла Аўгеньня і прыхінулася ля акна, каб ад хворай далёка не адхадзіць і дасачыць, ці ходзіць ён па дарожцы ў садзе.

Ціша панавала ўва ўсім будынку і садзе, потым гадзіньнік празваніў адзінаццаць ці дванаццаць, дзяўчына добра ня зьлічыла, і ўзноў усё-чыста сьціхла, толькі пясочак скрыпае пад нагамі ў профэсара—чуваць у вакно.

Слухае Аўгеньня і пачала патроху разьбіраць, што там шэпча з гора чалавек.

— Вольгачка, Вольгачка, ты й навука— усё жыцьцё маё. Ты,—кажа,—ахарашыла для мяне навуку, а без цябе й навука ні ўва што.

Потым раздумаўся, памаўчаў дый кажа, быццам няўмысьля лютуючы сябе:

— Не,—кажа,—навука вышэй за цябе, навука вышэй за ўсё і без навукі мне было-б

нудна нават з табою, хоць ты адна і найлепшая для мяне ўва ўсім сьвеце. І ты памрэш, і я памру, а навука не павінна памерці і здрады не павінна цярпець.

„Божухна-бацюхна!“—памысьліла дзяўчына,—„ня любіць ён жонкі, усе мужчыны такія: то халярue ад каханьня, то гатоў за якуюсьці навуку на сьмерць жонку аддаць“.

— Памрэш ты, Вольгачка,—шэпча ён далей,—і застанецца мне адна пацеха— навука мая. Дык ці-ж магу абразіць яе забабонамі? Гэтая нітка—зьнявага для навукі і для майго імя.

І шмат чаго яшчэ казаў здурнелы ад гора профэсар, што і зразумець не магла Аўгеньня. Адно ўцяміла, што яму хочацца зрабіць так, як казаў яе дзядзька Якім, але чамусь сорамна яму рабіць тое

— Тут,—кажа,—справа ня ў нітцы і не ў забабоне, а ў здрадзе навуцы, якую любіў, калі яшчэ й Вольгачкі ня любіў

— Няўжо-ж,—кажа,—магу я напляваць на сваю веру?

„І якая тут вера ў яго“,—мысьліць дзяўчына,—„калі нават папа прывезьці спавядаць жонку перад сьмерцю і то не дазволіў старой пані,—анцыхрыста стары!“

Аж раптам чуець яна: затупаў пан нагамі па зямлі, як няўдалы дзіцёнак, потым кінуўся за дрэва і давай калаціць яго на ўсю сілу, давай трэсьці.

Хацела бегчы дзяўчына па старую паню, ды ад страху прыліпла к сьценцы, думае сабе:

„А што, як сапраўды здурнеў і паляціць сюды біцца? Вялікі, здаровы — задавіць на сьмерць". А ён калаціў, калаціў дрэва, адпусьціўся і ціха, але жудасна, аж скура стыгне, зарагатаў:

—Пляваць мне на цябе, навука, калі ты бясьсільная!

Сьціх і йдзець у пакоі, а тымчасам Аўгеньня шмыгнула да хворай і млее там: што гэта будзе? Хворая-ж ляжала, як мярцьвяк. „Можа й памёрла ўжо?"— паглядае на яе дзяўчына і баіцца падыйсьці.

Тымчасам прыблізіўся на мысічках прафэсар, прыхіліў да жончыных грудзей галаву, паслухаў: „Дыхае"— шэпча Аўгеньні і ківае да сябе пальцам, гукае Аўгеньню за сабою. Як вышлі, пытаецца: „Ці няма ў цябе, Аўгінка, пад рукою якой нітачкі? Буду паперы разьбіраць у габінэце, трэба зьвязаць у пачкі".

Зразумела яна, на якую патрэбу просіць нітку і зараз зьбегала ў сваю каморку, прынясла.

— Ну, галубка, ідзі троху пасьпі,— сказаў ёй прафэсар;— я пакуль што адзін пабуду, а як трэба, дык узбуджу

Пашла Аўгеньня, а троху пачакаўшы, дасачыла з-за вушака: абвязвае наўчоны прафэсар хворую жонку ніткаю. Абвязаў, асьцярожненька прапусьціўшы пад ногі і пацягнуўшы вышэй пад тулава, патым пацалаваў жонку ў лоб, пераксьціў (чаго ніколі, ніколі раней не рабіў) і з ніткаю ў руцэ паціхеньку вышаў у сад.

Аўгеньня сьцяміла, што ён пабрыў за сіні плот на раздарожжа і была дужа рада.

Калі ён вярнуўся, дзяўчына паіла хворую паню вадою з узьбітым бялком і віном.

— А я трошкі прагуляўся, - вінавата, але спакойна й радасна казаў профэсар: — ах якая прыгожая ноч, дрэвы сьпяць і скрозь сон варушаць лісьцейкам... Ну як ты сябе чуеш, рыбка мая?

— Як-бы лепей...—усьміхнулася яму хворая цянюсенькімі вуснамі і раскрыла вочы.

— Чамусь мне верыцца, рыбка мая, што ты з гэтае начы пачнеш папраўляцца... У цябе сягоньня быў крызіс. Вось пабачыш, рыбка!

— Мне лепей... чую, што лепей!—парадавала мужа хворая і пацягнула худзенькую, васковую ручку, каб пацалаваў:—Цяпер ідзі спаць, мой любы.

Назаўтра Аўгеньня зьбегала да дзядзькі і сказала, што пан такі даўся з сваёю навукаю. Усе людзі з надзеяй чакалі паляпшэньня хворай.

Але не магла памагчы навука,—не памаглі і забабоны. На трэці дзень хворая сканала.

„Дурны настаўнік“

Гадоў, мусіць, шмат мінулася з таго часу, як можна было яго бачыць на вуліцах у Мсьціслаўлі.

Апранены ў нейкі абадраны балахон, няголены, валасаты, з даўгімі, чорнымі ад гразі кіпцамі. Вочы ў яго змучаныя, несупакойныя і невясёлыя. Ніколі не глядзіць ён на другога чалавека проста, а ўсё некуды ўхіляецца быццам шукае чаго ці прыглядаецца да нечага, што стаіць у вас за плячмі.

Бывала, цалюткі дзень, ад раньня і да познага, шарпае апоркамі на босую нагу па хадніках ці па каменьню. Ато яшчэ і ў ночы бродзіць ды гамоніць з вартаўнікамі.

У кірмашовы дзень ходзіць сабе ціха між народу, прыглядаецца да наехаўшых сялян, шукаючы знаёмых, каб папрасіць гуркоў ці яблык.

У будзённы дзень часам бадзяецца, сагнуўшыся, па рынку; зьбірае раструшанае па зямлі сена і корміць коз; ато наводзіць на пабожных перакупак страх—затым, што ціханька падыйдзе і ўмаўляе:

— Сястрыцы вы мае! бога няма, каб я так жыў,—няма...

— А матачка найвышняя! Што ён гаворыць!—хрысьцяцца спалоханыя перакупкі і ўпрашаюць яго, каб не казаў так.—Маўчы, маўчы, Якуб Цімохавіч! Гарадавы блізка...

— Кгаспадзін настаўнік!—скажа яму якінебудзь крамнік-падшывалец. Кгаспадзін настаўнік! Гарадавога блізка нет! На бублік: плюнь на царкву!

Ён паглядзіць у той бок, дзе гарадзкі сабор або Тупічаўскі манастыр, паглядзіцьпаглядзіць, і плюне... Моўчкі возьме бублік і есьць. А дурні рагочуць.

Як часам надта лезуць яму ў вочы, ён нічога не бярэць ды яшчэ й крыкне:

— Смаўжы сьляпыя! Плюю на вашу веру і на вас плюю.

І плюне на каторага. Ох, яны тады палохаюць: „Гарадавой ідзёт! Гарадавой ідзёт!“

Але ён нічога не баіцца. Ён плюне на царкву, на касьцёл, на сынагогу—хоць бы на воку ў самога цара ці губарнатара. Хіба гарадавы ласкава папросіць, каб хаця пры ім блізка не рабіў так, дык ён паслухае, пры ім высьцерагаецца, каб прыкрасьці яму ў яго службе ня было.

Дык вось жа гэты самы „дурны настаўнік“, як празвалі яго людзі, або Якуб Цімохавіч Кубраковіч, як было яго праўдзівае імя, быў раней настаўнікам у нашай Шамаўскай воласьці, так што ведалі тут усю яго нешчасьлівую гісторыю.

Родам ён быў з Мсьціслаўля. Відаць, дзед яго ці прадзед хадзіў па сьвеце кубраком,— значыцца, зьбіраў на збудаваньне новых ці ўхарашэньне старых цэркваў,—адкуль і прозьвішча ўзялося: Кубраковічы. І бацька яго знаўся з папамі ды дзякамі; быў п'яніца і піў з імі пакуль было за што, а як зьвёўся з капылоў далоў, пашоў у званары за паўтраця рублі на месяц, званіў і вартаваў царкву начою, каб зладзеі не абакралі. Маці плацьце людзём мыла і гароднае насеньне прадавала. Так і жылі, і сын, хоць і невялікай адукацыі, а-ткі дашоў, у вясковыя настаўнікі прабіўся.

Перавялі яго да нас з другое воласьці, дзе не паладзіў, кажуць, з бацюшкам. Вядома, у той час настаўнікі з бацюшкамі часта сварыліся. Калі ня хочацца настаўніку дапамагаць у царкеўнай службе, ці ня дужа нізка пакланіцца ён матушцы ці так чым не дагодзіць папу або дзяку і іхным чадам, напрыклад, ня ходзіць да пападзянак або з дзячышак сьмешкі строіць, дык зараз на яго папера й паляціць: „Так і так, настаўнік у тутэйшай школе–вольнадум, у царкву ня ходзіць, дзяцей богу ня моліць і добраму не навучае“... Трах, і перавялі яго ў другую, горшую за тую школу або й зусім прагналі сабак пасьціць.

У нас тады быў поп старэнькі, на прозьвішча Бекарэвіч. „Ня дужа мудры, казалі пра яго сяляне,—дык і ня дрэнны: хрысьціць, вянчае і на той сьвет з паратам адпраўляе, а

ўва што лішняе ня лезе і да людзей ня чэпіцца... Добры поп". І з новым настаўнікам яны пасябраваліся. Рыбу лавіць ці ў грыбы, ці ў ягады—разам хадзілі. Адно толькі дакучала старэнькаму, што настаўнік любіў гаманіць пра бога і пра ўсякія такія справы.

— Ня люблю я тваіх мудрых гутарак, Якубе!—казаў старэнькі Бекарэвіч Кубраковічу.—Што табе ўсё карціць: чаму так, чаму ня гэтак? Ну як было, так і было... „Ня прыемлі імя госпада бога твайго ўсуе". Ты мне толькі рыбу пудзіш... А я люблю, мой браткy, супакой.

Затое была ў папа за гаспадыню, бо адзінокі жыў на старасьці, нейкая далёкая сястра ці то швагерка. Сухая дужа і з чорнымі вусікамі, але вельмі пабожная, начытаная ў сьвятых кнігах і гаваркая. Яна і заступіла маўклівага бацюшку ў размовах з настаўнікам. Вечна яны бывала сьпіраюцца, як што калі тварылася, і чаму так, а чаму ня гэтак. Яна верыла ўва ўсякія забабоны, а Якуб Цімохавіч даводзіў ёй, што ня ўсякай лухце можна верыць. Поп слухае-слухае дый пойдзе спаць, а яны ўспомняць, як той казаў, і бога і хрыста, і лазовага куста.

І сталі дзейкаць людзі, што новы наш настаўнік і добры і нядобры. Добры за тое, што дзеці яго ўлюбілі, старанна вучыць, не адпускае школьнікаў да цёмнага,—ня тое, што другі: не пасьпеюць бабы ля печы ўправіцца, а ён ужо распусьціў іх. А нядобры, што нейкі ён дзіўны... Не займаецца ні з паненкамі,

ні з чаркаю, ні ў карты. Толькі ў яго і занятку: адпусьціць школьнікаў і йдзець да паповае швагеркі на дыспутасы ці сядае за свае, хто ведае, што там за кніжкі за такія нязвычайна цікавыя, і марнуецца над імі да познай ночкі.

І ўжо тады троху-патроху пачало выплываць на яву, што няцьвёрды ён у веры чалавек. Ня йме веры то ў тое, то ў сёе, ува што спрадвеку верылі ўсе людзі. Падсьмейваецца з паповае швагеркі, што яна, калі гадзіна ўкусіла іхную карову і паповы малітвы рады не далі, запрасіла лясьніка шаптаць і пасьля казала, што ад таго шаптаньня карова ачуняла. І так шмат у чым пракідалася яго слабая вера ці й зусім нявера на погляд тутэйшых людзей.

— А хіба-ж кожны ведае,—казалі тады ў нас людзі,—чаму ў іншага лясьніка хоць якая нягодная стрэльба лучае ў лёт самую шпаркую птушку? Або чаму самы бедны гарапашнік ані з тога, ані з сёга раптам робіцца багатыром на ўсю акругу?

— Таму так робіцца,—казалі яны тое што чулі ад сваіх бацькоў і ад дзядоў,—таму, што гэткі-то д'ябальскі паслужнік, калі прычашчаецца, дык пакіне кашку ў роце, выйме з роту ў хустачку і схавае; потым, выбраўшы цёмную часіну, ідзе ў самыя глухія нетры, прывяжа кашку на асінавым суку і стрэліць...

— А як толькі ён, гэткі акаянны, складзецца стрэльбаю, дык разам асьвеціцца яму

ўся-чыста пушча няземным, як-бы ад вялізнае маланкі, ці як-бы сонца шухне яму з неба ў вочы, такім сьвятлом, сьціхне зямелька, панікнуць і застыгнуць ад жудасьці дрэвы, паваляцца й прыліпнуць бяз дыханьня травы, і здасца яму: вісіць распнуты на крыжы, раны точацца сьвежаю крывёю, а з вачэй капаюць жалкія сьлёзы...

— З другога на гэтым месцы і дух вон, а другі, карэлы, стрэліць—і тады мае на паслугах усю нячыстую сілу...

Якуб Цімохавіч, мусіць, і змалку тое чуў і ведаў, але хто-ж бы мог нават падумаць, што яму ўроіцца ў галаву зрабіць і практыку.

Вось прышоў вялікі пост. Вясна чулася ў паветры. Спошчаныя людцы да споведзі хадзілі, паглядаючы дарожкамі, ці ўжо ёсьць пра-талінкі, ці ўжо блізка вясёнка цяпленька, калі мінецца ім адна нішчымная бульба, а можна будзе і сьвежай траўкі згатаваць і малачком яе забеліць.

Пашоў у споведзь і Якуб Цімохавіч. Пасьля казалі, што ўжо й тады відаць было па ім, што задумаў нешта нядобрае. Ды нікому нічога ані ў дум.

Тымчасам вясна й закрасавала. Распусьціўся лес, зашумелі гоманам дубровы, ночы цёмныя прышлі, хлопчыкі коні на начлег вадзілі. Даўно скончыў Якуб Цімохавіч заняткі ў школе, толькі-ж, замест паправіцца пасьля настаўніцкае працы скрозь цэлую зіму,

дык ён зблажэў яшчэ на горшае: высах, чорны зробіўся. „Што яму такое?“—дзівіліся людзі. А гэта ён, задумаўшы адно, а чуючы і ад папа і ад яго швагеркі зусім што іншае, мусіць, стаў вагацца сам у сабе... Быў-жа ён ня дужа ўчоны, дый навука была даўней пабожная,—і хоць розумам сваім ён чуў, што на яго-ткі баку праўда, але ня дзіва, што мог і завагацца, калі што дня слухаў пабожныя гаворкі і бачыў каля сябе адну спрадвечную цямноту.

Але зрабіў-ткі.

На самае купальле пашоў у лес, узяўшы стрэльбу і схаванае прычасьце.

Пасьля ён сам ня тоіўся і пераказваў, што яму там думалася ў лесе. Адзін ды ў цёмным—ён быў пачаў зьбівацца з сваіх даўнейшых думак. Чакаў паўночы—і здалося яму векам, пакуль сядзеў там у гушчарніку і нейк тупа разважаў: „Што я вытвараю? Прыгожы забабон зрабіў сабе нейкаю хваробаю! Хто робіць досьлед, рэжучы на кавалкі чалавечы труп або сьлепячы вочы мікроскопам, а я сяджу, як дурань, пад дрыжачаю асінаю... Хто робіць досьлед дзеля навукі, а я—каб пахваліцца, што не збаяўся страху, і мне нічога не здалося“... А калі налязала на яго цямнота з пушчы, калі слабела яснасьць думкі яшчэ болей, тады спадчына многіх вякоў і пакаленьняў гаварыла яму, што зараз пабачыць ён у пушчы розныя нязвычайныя купальскія дзівы,—хай-жа не баіцца! Што зараз пачнуць здавацца яму ніколі нябачаныя стра-

шыдлы і зьвярукі, баран з адрэзанаю галавою будзе бегчы на яго, будуць кугакаць страшна совы, зацьвіце заклятая краска папараці, пад нагамі засіпяць вужакі, павыпаўзаюць з нор агідныя рапухі, яшчаркі... І ўжо хацелася, каб-жа хоць нешта незразумелае, дзіўное зьявілася ў ваччу. Хай-бы хоць здалося, што папараць цьвіце, калі ўжо ботанікі даводзяць, што яна цьвісьці ня можа, не такая расьліна

Сонна шумела чорная дуброва, спалі зьвяры і птушкі, не варушылася мураўка на нявіднай упоцемку зямлі.

І Якуб Цімохавіч фальшыва пацяшаў сябе самога: „Ды ты й ня думаў верыць у прыгожы забабон .. От, так сабе пашоў палюбавацца на хараство соннае дубровы купальскай ночкаю... Бачыш, як хораша, як люба і як ціха! Прырода ёсьць прырода: бяздонная крыніца для навуковых досьледаў і багаты матэрыял для пясьнярскай творчасьці... Ну, ты ўжо задаволіўся... Ідзі спаць... Цябе ўжо морыць сон“...

„О, не! Як-жа так пайсьці? Пабачым“...

Раздаўся шумны стрэл, дзугнула стрэльба ў плячо і ў санкі няўмеламу стральцу.

Сьціхла...

Шуміць патроху сонная дуброва, цёмна, пах ад лесу і пах ад стрэлу... І ўжо—толькі пах ад лесу, і зноў усё, як і было!

Нічога не здалося, нічога няма, усё звычайна...

Тым-бы справа й скончылася. Але нешта адзін раз упаілі добрыя людзі Якуба Цімоха-

віча на кірмашы ў Мсьціслаўлі, і ён, хмельны, пачаў верзьці не да рэчы, што хадзіў у лес і рабіў там практыку... Разьбегліся добрыя людзі, як ад дурнога. Але забылася і гэта. Потым паспрачаўся ён з тым лясьнікам, што лячыў папу карову. Лясьнік казаў, што настаўніцкая навука нічога ня варта, што яго, чараўніцкая, мацнейшая. І тут тож ня ўцерпеў Якуб Цімохавіч і бракнуў яму ў вочы, што ўсё яго чараўніцтва—адна мана, што вось ён рабіў адну такую практыку, і нічога яму не здалося... Як на шалёнага, паглядзеў на яго і лясьнік, але добра ня ведаючы, якую такую практыку рабіў настаўнік, ён нічога не сказаў і толькі зараз ад яго ўцёк ды затаіў на яго злосьць. Аднак, пашлі гаворкі, адно з другім сплялося, і дачулася-ткі і пабожная папоўская швагерка. Ледзьве не самлела ад вялікага страху, але гукнула Якуба Цімохавіча і стала дапытвацца, чаму гэта пра яго людзі дрэннае гавораць. І тут ня ўцерпеў Якуб Цімохавіч, ня ўцерпеў на сваю вялікую бяду. Жартуючы, сказаў ён. што, ці праўду людзі кажуць, ці няпраўду, але, мусіць, каб яно было, дык так-бы толькі і было,—што-б там здалося? Бацюшка якраз быў хворы, швагерка баялася, што ён хутка памрэ, і ўсё малілася. Калі-ж пачула такія жудасныя для яе словы, яна ня ведала, ці бес улез у гэтага настаўніка, ці ён здурнеў ад лішніх думак... І, пажалеўшы яго, напісала ў паліцыю заяву, што здурнеў настаўнік, бо каб напісала, што здаровы, а гэтак кажа, дык, мусіць, пакаралі-б яго сьмерцю або вечнай катаргай. Прыеха-

лі, заарыштавалі, нявolілі ў астрозе і ў жоўтым доме... Нарэшце, выпусьцілі, як ціхага дурнога. Казалі, што і ён сам прыкінуўся дурным, спалохаўшыся кары. Шмат чаго казалі. Зьвёўся чалавек. Ня толькі якой працы, і пашпарта яму не давалі, цураліся яго, дурным празвалі. І, нарэшце, зрабіўся ён такім, якім можна было ўбачыць яго на вуліцах у Мсьціслаўлі. Ня сам зрабіўся,—разумныя людзі зрабілі... Але што-ж: які быў час, такое тады і ўсё было.

Трасца

Дзеелася гэта даўно,—тады, калі яшчэ дзяды нашы мусілі баяцца і пана, і бога, і чорта...

Дзеелася гэта тады, калі бедны чалавек мусіў за палена дроў цягацца па начы ў панскім лесе...

Дзеелася гэта тады, калі цёмны чалавек, змарнованы цяжарам працы, усяго баяўся і ўва ўсё верыў, і нават хваробу сваю зьвязваў з усякімі зданьнямі...

Трасца прычапілася к яму вясною, калі ён хадзіў у ночы ў панскі лес красьці дровы. Ноч была месячная і ёдкая. З хаты ён вышаў, як папелі першыя пеўні. Па дарозе яму нічога не здалося. Ціха спалі будынкі. У голым полі веяў халаднаваты ветрык. Ад саджалак цягнула веснавою мокрасьцю. Чалавек спакойна перапупіў граніцу і падаўся глыбей у лес. Незабавам узьбіўся ён на добры лом, папляваў у рукі і з прыемнасьцю, але паціху, асьцярожна завінуўся над паваленай бярэзінай. Хапаўся і дзеля таго троху лішне ўвагрэўся. Потым, не марудзячы заткнуў сякеру ззаду за паяс, узваліў бярэзіну на правае плячо і, доўга ня думаўшы, засігаў шыбчэй назад. Сьпярша лясіна не здавалася цяжкою. Аднак, калі вышаў ён на поле, дзе пачыналась панаваньне месяца і хола-

ду, несьці стала цяжка. Лясіна гнула яго ўніз і за кароткі час намуляла яму і правае, і левае плячо. Сам зьдзіўлены сваёю слабасьцю, ён падумаў, што трэба адсячы кавалак макушкі, бо толькі гутаецца і замінае несьці, а карысьці з яе мала. Скінуў лясіну і прыстоіў; абцёр пот. І тады пачуў на сьпіне, пад кажушком, няпрыемны дрыгкі халадок. „Э, ці гэта ня бывае“, падумаў сам сабе, узяў сякеру ў рукі і нахіліўся, шукаючы, дзе-б адсячы канец лясіны. Аж раптам неўспадзеўкі, з подзівам заўважыў, што ззаду, яшчэ нехта жывы поркаецца па зямлі. Прыгледзеўся пільней і па месяцу ўбачыў, што гэта нейкая баба. Ня стаўшы адсякаць канца, падняў ізноў лясіну і моўчкі, ня гледзячы назад, ішоў да самай хаты. Гэта яшчэ ня быў страх, а ўсё-ж ткі там на сьпіне, дзе чуўся халадок, цяпер зрабілася аж надта цёпла.—Папсавала мне работу,—ціха сказаў ён сам сабе, злажыўшы бярэзіну ля хаты пад страху, сеў тут-жа пад страхою і закурыў піпку. Тымчасам пеўні прапелі ў-друга, ён падумаў: „Якога ліха баяцца“, і пашоў у лес яшчэ раз..

Разважаць аб зданьнях ён не хацеў, але цяпер мімаволі час-ад-асу пытаўся ў свае памяці: ці гэта ён бачыў жывую бабу, ці гэта яму толькі здалося? І цяпер ён ня дужа сьмела йшоў туды, дзе спадзяваўся болей сухога буралому. У лесе быў яшчэ сьнег; бялеў і хрупаў пад нагамі, разганяючы дурныя страхі цішы і поцемкаў. Усё было ціха, нідзе ніхто не варушыўся, не здаваўся.

Зараз трапіўся яму сухі пень. Хацелася курыць, ды адлажыў ужо да хаты, абчысьціў з большага пень ад кары, узваліў яго на плечы і маўчаком пасунуў к полю. Бабы ня было. Па дарозе ён сьмела строіў здогады, што, мусіць, і яна таксама крала дровы, толькі не спазнаў яе—адкуль і хто. Так вышаў ён на поле. У гразкім пераходзе хацеў папраўіцца, каб лепей было несьці, азірнуўся... аж сунецца тая баба! На сьпіне ў яго, пад кажухом, дзе было так горача, разьліўся мокры холад, а троху ўмочаныя ногі занылі, як пасьля доўгае і труднае хадні ці ад рэматызму,—і засягаў, больш не азіраючыся. Тое, што блізка былі хаты з людзьмі, паддавала яму болей сьмеласьці. Злосьць яго ўзяла: чаго, думае сабе, учапілася за ім дурная баба, як той сабачы хвост за ваўком?—„Ча' яе за мною носіць?"—развжаў, абціраючы сьцюдзёны пот і зашпіляючы каўнер, бо ёдкае паветра ахапіла яго ўсяго..

Кінуўшы пад страхою пень, прышоў у хату, каб трошку адпачыць і сагрэцца. Жонка заварушылася, пачуўшы яго.—„Ці ў дровы хадзіў?"—спыталася.—„Ага. Прынёс макушку і пянушок... дый яшчэ раз думаю схадзіць",—адказаў ёй, пыхкаючы ў сьветлаватай ад месяца хаце, аб тэй-жа старой змоўчыў, каб не спалохаць жонку. „Яшчэ пабаіцца адна з дзяцьмі заставацца ў хаце", так падумаў. Хацеў пераабуцца, бо мокрыя аборы надта ўрэзаліся ў ногі, толькі мала часу меў да сьвітаньня, дык ня стаў. І піць яму захацелася. Жонка, як на тое, устала паіць хлопчыка, дык і ён

ня ўцерпеў, напіўся і выпіў болей, чым можна піць, спацеўшы.—„А я ўсё нейкую дурную сьніла“,—сказала жонка, кладучыся ізноў на пасьцелю, і, відаць, манілася зараз, хоць каротка пераказаць яму свой сон. Ён-жа наўмысьля ня стаў слухаць і пашоў у лес трэці раз.

Пабрыў за гумны з цікаўнасьцю і страхам: стрэнець ён цяпер гэтую старую ці не? А ў жончыныя сны ня дужа вер.ў, бо жонцы заўсяды нешта нейкае вярзлося. На полі нікога ня было. Неба ачысьцілась ад хмар, выплыў месяц у другой квадры. Усё асьвяцілася спакойна-сонным яго сьвятлом, ёдкасьць спусьцілася ў мокрыя нізіны, паветра пазванчэла, і дзесь адзаду, сярод хат, гаўкнуў сабака, за ім яшчэ другі. Чалавек супакоіўся, шыбка скакаў з сухога на сухое, каб угрэцца й пасьмялець. Над цёмным лесам зьявіўся невялічкі, але рэзкі гэткаю парою вецер, і макушкі зьлёгку зашумелі, заківаліся. Ступіўшы цяпер у лес, напалоханы чалавек разы са тры перакасьціўся зморанаю цяжкім пнём рукою,— ня тое што дл. страху, але т к, на ўсякае ўсё. І пачуў, што яму робіцца сьцюдзёна ня зусім так, як бывае звычайна. „Хоць-бы трасцу не схапіць“, дзіўна аслабеўшы на кароткі час духам, падумаў ён і злаяў старую: „Прычапілася-ж, падла, ні стуль, ні сьсюль“. Яе-ж пакуль што ня было, і пашоў ён гэтым разам ня туды, дзе знашоў макушку і пень, а троху ўбок. Тут ён зараз сабраў ношку сухога паленьня, ды неяк трапіў у благое месца: пад нагамі хлюпала вада, ён яшчэ болей

памачыў ногі, аббрызкаўся вадою і ўпэцкаўся ў леташні хваёвыя голкі, зьмешаныя з гразёю. Толькі ўзьняў ён ношку на плечы, глядзіць аж баба тая стаіць побач... Па ім прабегла палахлівая дрыготка. Стала ворашна й сьцюдзёна... Маўкліва панёс ношку,—і цяпер самі сабою закалаціліся ў яго зубы: д-д-д-д... Хваравітая, мляўкая асьцюдзянеласьць пашла па ўсім целе, і чалавек са страхам памысьліў, што трасца апанавала яго. Цяпер ужо ён ня мог саўладаць з дрыготкаю, барджэй адкінуў колькі паленьняў і панура вышаў з лесу на поле. Прырода ўсё яшчэ ціхамірна спала, толькі як-бы троху паслабела месячнае сьвятло, і паветра пацямнела ў нізінах, а ядранейшым і сьвятлейшым зрабілася, здаецца, над галавою. Там, дзе дагэтуль маўчалі хаты, закукарэкалі трэцім разам пеўні, у вадным акенцы бліснула было сьвятло, ды йзноў згасла: відаць, хацелі там ужо ўставаць, але ўбачылі, што яшчэ вельмі рана. Яго трасло і трасло... Рады, што падышоў да хат, кінуў ён ношку ля гумна і ўгрунь пабег у хату—мокры, спацелы, сьцюдзённы

„Яшчэ прынёс?“—прыхільна спыталася жонка. Ён маўчаў і мокрымі ад поту і ад вады рукамі раскручваў аборыну. Зубы яго ляскаталі, усё цела калацілася, а часам яго ўсяго няведамая сіла кідала з боку у бок. Мляўкая асьцюдзянеласьць разьлівалася ад патыліцы к сярэдзіне. усё цяплеючы й вяшчуючы, гарачку. Жонка зьдзівілася яго маўчаньню, боязка прыслухалась і тады пачула дроб-

ненькае зуб аб зуб: д-д-д-д... Яна схапілася з пасьцелі і падышла ды нахінулася:—„Што табе? Чаго маўчыш?“—А ён усё маўчаў.—„Што табе!“—крыкнула ў упудзе і кінулася паліць лучыну.—„Н-н-не п-п-па-л-і-іі“—насілу вымавіў, трасучыся ўвесь, мужык, а тады сьцюдзёнымі ліпкімі, як мярцьвец ці жаба, пальцамі ўзяў яе за руку і пацягнуў к акну. Шлёпаў голаю, разутаю нагою і чвякаў другою, абутаю. І калаціўся, як асінавы ліст пад вялікім ветрам. Яна з жахам зірнула ў акно... Прыхіліўшыся да яе вуха, ён стаў шаптаць, вымаўляючы склад за складам, слова за словам: ці не стаіць там на месячным відным надвор'і, на гародзе, між блізкаю, віднейшаю пуняю і далячэйшым, цёмным гумном, пахілая чорная постаць? Жонка слухала і глядзела, як зачараваная. Тады раптам жахліва адшаснулася ад акна; хоць там, пэўна-ж, нічога ня ўбачыла, але і ёй здалося, што быццам нешта чорнае мільгаецца там у ваччу. Яна рынулася к полу, схапіла там першае што трапіла пад руку,—спадніцу—і, распасьцёршы яе ў руках захінула акно. У хаце зрабілася цёмна і нязручна, але затое забаронна ад надворнага ліха. Зачапіла яна спадніцу адным ражком за крук у сьценцы, а другі падціснула пад налесьнік. Край спадніцы апаў... Вузкая коска белага месяца няроўна праскачыла ў хату—і спалохала іх абаіх. Ня палячы сьвятла, памагла жонка мужыку ўзьлезьці на пол, на пасьцелю, на якой ён і пракачаўся дзён дваццаць з гакам у хваробе і выпятрыў на шчэпку ад гарачкі...

Сасна

І ёсьць на нашым полі вялізная кучматая сасна, старая-прастарая. Стаіць яна ўбаку ад новае дарогі, там, дзе калісь праходзіў стары шлях. Гаспадар шнура, на якім яна прышлася, даўно зьвёў-бы яе со сьвету, каб не баяўся, што ад гэтага яму трапіцца нейкая бяда. Дый усе людзі так прызвычаіліся бачыць гэтую сасну, што без яе, здаецца, і поле нашае было-б ня тое.

Вось аб гэтай-то сасьне многа чаго кажуць старыя людзі, спамінаючы стары, даўнамінулы час.

Яшчэ да вольніцы жыў у нашай вёсцы заможны гаспадар. Шмат грошы назьбіраў ён за сваё жыцьцё, бо скнарыца быў—што няхай такіх ня будзе. Прадасьць, бывала, збожжа, лён ці канаплі, дык бубліка дзяцём ня купіць на гасьцінец. А калі зьявіліся пазьнейшым часам крупадзёркі і млыны, то нізашта не хацеў завезьці, каб яму абдзёрлі ці змалолі; бабы мусілі, як і даўней, таўчы-душыцца ў ступе крупы і малоць мелева на сваіх хатніх жорнах.

Меў ён чатырох сыноў. Тры засталіся гаспадарыць, а самы маладзейшы, на ймя Васіль, з панскага загаду прыстаў да немца-

млынара ў навуку. Малоць ён добра не наўчыўся, але затое навучыўся маляваць, ад немца, абразы.

Не спадабалася яго старому бацьку, што сын займаецца такою-то лухтою: малюе дрэвы, хаты і людзей.

— Гэта, кажа, панская або нямецкая забаўка, а мужыка яна толькі псуе!

А ў немца ды была харошая дачка, звалася Эльза,—хлапец вазьмі дый закахайся. Яна, бывала, ходзіць бавіцца пад тэй сасною, а ён малюе кучматую сасну і сваю дзяўчыну пад сасною. Урэшце, так добра стаў ён маляваць, что перашоў нават і немца, і шмат намаляваў вялізных абразоў па просьбе бацюшкі ў царкву. Толькі іх пасьля з царквы павыкідалі.

Аднойчы дужа заняўздоліў стары той гаспадар, думаў, што памрэць, гукнуў сваіх трох большых і сказаў:

— Дзеткі! Дужа я хворы, можа памру, дык хачу вас падзяліць, каб вы па маёй сьмерці не калаціліся за бацькава дабро.

— Што-ж ты дзеліш толькі траіх?—спыталася старая.—Чаму ж ты Васіля ня дзеліш?

І сыны ўмяшаліся. Сталі прасіць бацьку, каб ня крыўдзіў ён і меншага, Васіля.

— Дык я, гэта, яго крыўджу?!—з гневам сказаў хворы.—Не, ня я, а ён мяне пакрыўдзіў! Бо вы, дзеткі, пашлі добрым торам, а ён не.

— Можа ён яшчэ абдумаецца,—прасіла за сына маці.

— Абдумаецца? Не, ніколі ён не абдумаецца, калі дагэтуль не абдумаўся,—гневаўся, не мякчэючы, стары.—Я, кажа, скрозь цэлае сваё жыцьцё зьбіраў дабро; прадаўшы, бывала, збожжа, лён ці канаплі—соткі гарэлкі ні разу не выпіў. Скрозь увесь век свой хадзіў я ў лапцях, не хацеўшы траціцца на боты, хоць і меў за што. Адну шапку віславуху цягаў я зіму й лета гадоў дваццаць, а можа й болей .. Каб толькі сабраць вам... Мне-ж нічога ўжо ня трэба У ямку з сабою не вазьму. А Васіль лаяў мяне, бацьку свайго роднага. за гэтае маё стараньне. Ён боты носіць, ён паскудзтвам займаецца, дзевак мацае. Каму гэта патрэбна? Рукі мые па самыя локці... Дык няма-ж яму ад мяне нічога. Хай цалуецца з сваімі немцамі.

І так падзяліў гаспадарку між трыма старэйшымі сынамі, а маляру, за тое, што ня йшоў на яго зданьне, добраю дарогаю, ня даў нічога

Але гэтым разам не памёр стары,—апра віўся.

І стаў жыць цяпер адзін з старою, дастаючы часьціну збожжа ад аддзеленых сыноў і маючы, ведама, вялікі запас грошы.

Тымчасам ссадзіў за нейкую прамашку з млынарскае пасады немца пан. І пачаў наш бедны немец надта гараваць, бо зусім ня меў ён чаго есьці і ўсю сям'ю жывіў толькі

аднэю каваю, ды не праўдзіваю, а меленаю з жалудоў. Сям'я-ж, праўда, невялічкая была: сам ды жонка з тэю дачкою Эльзаю.

Дужа блізка ўзяў Васіль да сэрца бядацкае жыцьцё свае каханкі і пасабляў чым мог, цягаючы патрошкі з бацькавае гаспадаркі. Дадзела яму гаткае жыцьцё, і прышоў ён раз да бацькі прасіць, каб дазволіў бы яму жаніцца з немкаю і сесьці, з панскай ласкі, на гаспадарку. Пэўна, з тых замераў нічога-б і ня вышла, бо з хлапца ніякі быў гаспадар, яму абы часіна—зараз маляваць, а маляваньнем хлеба ня прыдбаеш. Але старому не спадабалася, што з немкаю. Сварыўся ён на сына-неўдалюгу, а колькі раз нават і з хаты выганяў.

Васіль, бывала, кажа:

— Тата! Сын я вам ці не? За што вы гневаецеся? Я-ж яе кахаю. Не вінават я, што кахаю, а яна не вінавата, што яна немка. Дазвольце мне жаніцца і сесьці на гаспадарку.

— Колам ты сядзь, сынок,—кажа яму бацька.—Каб я з месца ня сышоў, колькі я дам табе хаця што-небудзь.

— Вы не давайце. Вы толькі дазвольце мне жаніцца.

— Як? Дык ты нічога і ня просіш у мяне, сынку? А хацеў-жа сесьці на гаспадарку?

— Калі будзе на чым, сяду. А не—я з свайго промыслу пражыву. Я абразы ў царкву буду маляваць. Да млынара дзе-небудзь у памагачыя прыстану.

— Згінеш ты. Не пражывеш! А кінь немку і маляваньне, будзь чалавекам, дык нічога я табе не пашкадую, худога слова табе ніколі не скажу.

— Я кахаю Эльзу.

— Што ты ў ёй добрага знашоў? Немцы, сынку, ня нашы людзі, яны—гордыя. У бядзе сядзіць, жалудовай каваю толькі жывіцца, а прыйсьці з пакораю ня хоча. Ён чакае, што я пайду яму карыцца: „Дзякуй табе, пане млынару, што твая дачушка майму сыну галоўку завязала“. Не, недачаканьне...

— Тата! Эльза будзе вам як родная дачка.

— А-а, будзе! Цяпер ужо ў руку цалуе мне, спаткаўшыся: ветласьцю хоча падыйсьці. Не, мяне падбегамі ня купіць.

— Яна гэта робіць па шчырасьці, паважае вас як майго бацьку. Гэта звычай такі нямецкі. Няхай-жа тата ня думае нічога дрэннага.

— Блазень ты! Анямечылі яны цябе. Малюеш дрэвы, хаты і людзей, а гэта панская або нямецкая забаўка, і мужыка яна толькі псуе. Кінь ты свае забаўкі, будзь ты чалавекам!

Тым размовы іканчаліся.

Ня мог кінуць Васіль гэтых сваіх забавак, і не да забавак тут ужо ішло ..

Бяда ўжо тут надыходзіла, бо трэба было дзеўку да шлюбу весьці барджэй, за тое, што дапусьцілася да ліха. У немцаў, мусіць, глядзяць на тую справу троху лягчэй, як тое ў

нас паводзіцца. Спракудзілася дзеўка, а немец анічагусенькі: ня сварыцца, ня лае, адно п'е каву з жалудоў, чакаючы панура, калі дазволіць бацька пабрацца з ёю маляру.

П'е і спамінае мінулы час...

Млын гудзіць. Млынар ходзіць белы ад мукі. Вось бяжыць яго Эльзачка.

— „Татачка, а дзе Васіль?"

— „Ой, дзяўчынка! Нешта вельмі часта пытаешся ты Васіля".

— „Татачка! адпусьці ты яго сёньня з млыну. Мы пойдзем пагуляем пад сасною".

— „Чаму ўсё пад сасною?"

— „Васіль там будзе маляваць мяне".

— „Ну, ідзіце сабе: завозу мала".

— „Дзякую, татачка!"—скажа дзяўчынка і пабяжыць вясёлая.

Беленькая была такая немачка, з вялікаю касою, хоць і маладзенькая.

„Маладая дзяўчынка,—думае ўсьлед ёй ia бацька.—рана ты закахалася. Хлопец нічога сабе, але мужык. Бацька яго такі—каб яго чорт схапіў. Ат, клопат сабе!.. Гудзі, гудзі, маё кола! Мялі, мялі хлябок людзём! Будзем мы піць каву не жалудовую, а сапраўдную".

Ды не давялося яму піць сапраўдную каву. П'ець ён жалудовую. І кажа, адарваўшыся ад сумных успамінкаў і разваг:

— Эльза, Эльза! Дзіцятка маё! Што ты сядзіш? Што ты думаеш? Ты думаеш, што бацька твой ужо скінуты з млынарскае пасады? Што бацька твой - ужо бедны безработны чалавек? Што ён п'е жалудовую каву? Эльза, Эльза! Дзіцятка маё!

— Татачка, мы нешчасьлівыя людзі,—казала Эльза, хаваючы ад засмучоных бацькавых вачэй сваё кругленькае паднятае брушка.—Але мы яшчэ будзем шчасьлівыя, татачка!

А Васілёваму, аднак-жа, бацьку страшэнна не падабалася, што немцы ў гэтай-то бядзе ня думаюць яму карыцца, ня просяць, не наракаюць, пры спатканьні з ім дужа ветлівы, а дзяўчына нават і ў руку яму цалуе.

Зьнялюбела яму дзеўка за гэтую нямецкую пачцівасьць і яшчэ за тое, што любіла бавіцца пад тэй сасною. Мала таго, што бавіцца сама, Васіля туды з сабою цягне або цэлы табун дзяўчат вясковых прывядзе. Зьбяруцца там карагодам і пяюць ёй без пары вясельныя песьні.

Ато жартуюць:

— Як-жа ты, Эльзачка, белая красачка, з намі, мужыкамі, будзеш жыць, панскі прыгон адбываць, ня ўмеючы ані кросенцаў ткаць, ані жытца жаць?

А немачка сьмяецца, як блазнотка:

— Я, кажа, усё здолею, толькі ня дужа прызвычаена. Для Васількі свайго любага да ўсяго я прызвычаюся. Буду кросны ткаць і жыта жаць, і хлеб мясіць...

— А малаціць-жа ты ня умееш?

— Дык ці доўга мне навучыцца, Васіля кахаючы!

Кажа так, і ня сорам ёй...

Пагуляўшы, ідзець немачка з Васілём дамоў, пастаяць, пажалеюцца, пацалуюцца і ра-

зойдуцца: Эльзачка дамоў, а Васіль—да бацькі або ў панскі двор варту адбываць. А часам—і няма ведама, дзе ён начуе.

Ізноў сядзіць Эльзачка, сядзіць ды слухае бацькаву жальбу.

— Мы нешчасьлівыя людзі... так!—кажа стары немец, а нямкіня-маці плача, абціраючы ціханька сьлёзы белым хвартушком, і п'юць жалудовую каву. —Я нешчасьлівы бацька, Эльза! Табе даўно пара да шлюбу йсьці, Эльза! Паглядзі на сваё брушка, дзяўчынка мая! Яно расьцець так, як нашае няшчасьце. Што нам рабіць, Эльза, дзіцятка маё?

— Васіль, татачка, пагамоніць з сваім бацькам, татачка... Што рабіць? Ці я, бедная, ведаю? І я нешчасьлівая, бо за мяне і вы ў няшчасьці, мой любы татухна, мая любая мамухна. Але мы яшчэ будзем шчасьлівыя, мой татачка!

А старая нямкіня нап'ецца кавы і шые дзіцячыя каптуркі. Шые і абцірае сьлёзы.

Так ішоў час, і зусім крута прышлося немцам, а з ім разам і хлапцу. Што заробіць Эльза, шыючы сукенкі пападзянкам, тым толькі і жывілася з бацькамі. Васіль за ёю сох.

І вось адноўчы сьцягнуў ён з гора ў бацькі некалькі рублёў і панёс старой нямкіні, каб купіла чаго есьці.

Сядзелі тады немцы, гаманілі. Стары ўбачыў, што нехта йдзець, і кажа:

— Хто там ідзець, Эльза? Ці не Васіль?

— А хто да нас болей пойдзе? Васілёк ідзець, — адказала Эльза і пабегла на спатканьне.

Ён прышоў. Маўкліва сеў. Усе на яго глядзелі. Ён быў белы, як крэйда. Валасы зьмяклі ад поту.

— Ну? Васілёк?—падышла да яго Эльза і паклала сваю руку яму на галаву.

— Нічога...—насілу адказаў Васіль і адвёў яе руку, быццам яму сорамна ці дужа цяжка.

— Выпі з намі кавы, Васіль! Жалудовай кавы...—сказаў немец.

— Вось грошы...—паклаў Васіль скамечаную паперку на стол.

— Якія грошы?—спыталіся ўсеў адзін голас.

— Бацька даў? А, Васілёк?—дапытвалася Эльза.

— Усё роўна, хто даў... Будзем строіцца да шлюбу... Сёньня-ж.. Зараз... Ну, жыва!— казаў, як няпрытомны, Васіль. Быў зусім няладны.

Нямкіня ўзяла грошы і перадала старому. Той схаваў іх у кішэню ў штаны, напрануў сваю капоту і пашоў к Васілёваму бацьку. Прынёс яму грошы і просіць, каб ня гневаўся на сына.

Стары, замест паслухаць і, нарэшце, зьмілавацца, аблаяў немца і ўсю яго сям'ю, назваў Эльзу нехарошым словам і стаў клясьці ня-

ўдалага сына, кажучы, што цяпер і на парог яго да сябе ня пусьціць, што праклінае сына і дзяцей яго, і ўвесь яго род да сёмага калена...

— Зладзеяў, кажа, у нашым родзе ня было. Ён мне цяпер ня сын, а я ўжо яму ня бацька. Хай ідзець ад мяне, прокляты, куды сабе хоча!

Было гэта пад вечар. Калі немец вярнуўся, Васіль, забіты горам, кінуўся, сам ня ведаў куды, у поле. Але прыбег у бацькаў двор, увашоў у старую варывеньку, дзе начаваў, і парэзаў усе свае малюнкі і нагамі іх патаптаў. Потым пабег ізноў да немца. Позным вечарам бачылі яго людзі пад сасною ўдваіх з Эльзаю. Ён штосьці вельмі горача і з вялікім жалем і крыўдаю казаў ёй, прыпаўшы да сасновага камля, а яна хацела як-небудзь супакоіць яго, сядзела, схіліўшы галаву, і брала любага за рукі...

А ўночы сталася ліхая справа, якой спрадвеку ня было чутно ў нашым глухім баку... Засек Васіль сякераю старога бацьку, а сам на тэй сасьне засіліўся, бедны...

На раніцу прыехала начальства, зрабіла сьледзтва, старых немцаў і Эльзу павязьлі ў турму, старога дазволіла сыном хаваць, як хочуць, а забойцу, за тое, што задавіўся, сам адабраў сабе жыцьцё, дало загад закапаць тутжа пад сасною, бо хаваць такіх на могільніку з усімі нябожчыкамі разам—па хрысьціянскаму закону грэх, як і маліцца за іх

грэх. Так, бяз усякага абраду, як не чалавека, а жывёлу, і закапалі там.

Але-ж як сталі капаць яму магілу пад сасною, то і знашлі гаршчок з грашмі. Там, значыцца, хаваў стары сваё багацьце і ня любіў, што Эльза з моладзьдзю хадзіла па тым месцы. А яны хадзілі—і ані гадкі ім, што па грашох ходзяць...

І грошы тыя начальства забрала да скарбу.

А сасна і цяпер стаіць, толькі магілкі ня значна, бо яе і не рабілі,—пакінулі гладкае месца.

Багатая пчэльня

Мой сад калодамі
абведзен мёдных пчол,
што гаманяць, як не-
ўгамонныя музыкі...

Янка Купала.

А то вось яшчэ: жыў у часе паншчыны адзін заможны зямец.

Аддзяліўшыся ад бацькі, меў ён толькі хатку, хлявок ды пуньку. Тады разьвёў садок, дастаў ад свайго тсьця ў пасаг за жонкай дзьве калоды пчол, паставіў у садку і год за годам аграбаў раёў.

За гады тры было ў яго калод дзесяць. А забівала дарагоўля на вульлі. Добрая калода каштавала на той час сярэбраны рубель— дужа вялікія грошы. А плеценых з саломы зямец гэты ня любіў: бо ў іх пчолы не вядуцца і мёд гарчэйшы Дык ён набываў вульлі ў пана ў абмен на мёд, а ў іншых зямцоў— на адработ.

За гадоў колькі ля яго двара ґуд гудзеў: вульлі стаялі і ў садку, і пад стрэшкаю ля пуні, і на ўзьмежках на гародзе, і за плотам. Пчолы яго заміналі суседзям працаваць, кусалі коні, калі трэба гараць гарод, дзяцей кусалі, а часам і вялікіх людзей, асабліва баб.

Наогул зрабілася тут з імі цесна. Дык зямец мусіў вынасіцца ў лес, на расьцярэбы. Узяў у пана права на лапічак у лесе ў расьцярэбах, за дзесяць пуд мядовай дані ў год, і разьвёў там пчэльню.

Умеў-жа ён хадзіць ля пчол!

Ня бывала гэткіх прыпадкаў, каб у яго пчолы паміралі ўзімку, ці каб гнілец калі ўчапіўся. Не рабіў ён прагавітае падлазкі, не пакідаў пчалу на голад, умеў абараніць яе ад ворага. Сам-жа не займаўся ніякімі валхебамі і не хадзіў у сьцюжу прасьвердліваць вульлі суседу.

Ведама, другім зямцам, злосьнікам, завідасьць спакою не давала. Яны й паспрабавалі ваяваць...

Унадзіўся адзін, гэткі-то, хадзіць к яму як-бы па дружбе. Хадзіў-хадзіў, дружыў-дружыў, дый зрабіў ліха. У самую пільную пчаліную пару ўлетку, залез украдня ў ночы на яго пчэльню, абмазаў на вульлёх усе ходцы, лазы, лётку і тваркі сьмярдзючым салам і атручаным, дурманным мёдам, а сваіх пчол перад тым пачаставаў гарэлкаю ды імбірам, каб лютасьці набраліся. Прышоў дзянёк... Як паглядзеў зямец, што дзеецца, за галаву хапіўся! Поўзаюць яго пчолы, як сонныя мухі ў восень, а нечыя чужыя так і сякуць іх, так і сякуць, і мёд з вульлёў цягаюць. Доўга не чакаючы, пашоў ён сьледам за чужымі пчоламі і—прост к суседу-ліхадзею.

— Што-ж ты гэта, браце, нарабіў?!

Хацеў спачатку той адперціся, што і пчолы не яго, што і ведаць нічога ня ведае. Але

трудна яму адпірацца, калі ўсё відаць. Ну й кажа:

— Памірымся, кажа, толькі пану не пажалься.

— Каб ты мяне самога адурманіў ці пабіў, нікому жаліцца ня стаў-бы,—адказаў ён ліхадзею,—але за пчолак, безбаронных, нявінных жывёлінак, ці-ж можна дараваць?

— Што-ж ты мне ўчыніш?—пытаецца той.

— Калі адробіш зараз сваю нягодную работу, дык нічога ня ўчыню, забудуся на ўсё..

Убачыў ліхадзей, што злое не ўдалося, схапіў бярэма гунек, посьцілак, мяхоў, абвязаў свае калоды, каб яго п'яныя пчолы ня мелі выйсьця, потым кінуўся з мятнаю вадою да атручанае пчэльні, пазмыў пазмыў, што там напэцкаў, і кажа:

— Даруй, братка! Дзесятаму закажу... Толькі пан няхай нічога ня ведае!..

Нікому не пажаліўся зямец, тым справа й скончылася.

Таксама ніколі ня бывала, каб у таго зямца раі ўцякалі. Другі зямец бяжыць за роем з мокраю саломаю і кропіць, каб рой спусьціўся, сеў-бы. А рой ляціць сабе, ані-гу-гу. Ляціць у лес або ў чужы навужнік, падымаецца, як птушка,—і толькі яго бачылі. У яго-ж гэтак ні разу ня было. Заўсёды роя дапільнуе, ціхенька на сваім месцы аграбе, і свае хатнія часам ня ведаюць, што сёньня быў раёк ці колькі іх. З тых, што робяць з роем гармідару, ён толькі пасьмяхаецца. — Што гэта,

кажа, за такі зямец, што гоніцца за сваім роем аблаваю.—А траплялася-ж бывала, даўным часам, што няўдалыя зямцы і стрэльбаю стралялі, дагнаўшы роя верхам на кані, каб ён спусьціўся. І шкода, і сьмех, як рой ляціць, а людцы турацца за ім — з сярпамі, сечкамі, нажамі, бляхамі, і-і звоняць, балабоняць, крычаць: „Каб сеў! Каб сеў! Сеў-паў! Сеў-паў!“ Як быццам рой іх словы разумее? Галасу, можа, часам і спалохаецца, а прыказкаю рады не дасі.

Разьвёўшыся на пасеку ў панскіх расьцярэбах, зямец плаваў у мяду. Быў-жа тараваты: даць мёду не жалеў нікому. Даваў бедным людзём мёду на лекі, вузы прыкладваць на пухліну... Падлазіўшы, бывала, не шкадаваў ані сваім, ані чужым. Толькі ня любіў, калі хто лез к яму ў рабоце. Дый самі пчолкі, як ведама, ня любяць староньніх воч. Пчэльню ён абгарадзіў такім парканам, што ў шчыліну нічога ня відно, што там зямец робіць. Дзьверцы былі заўсёды зачынены.

І хораша-ж было ў яго на пчэльні! Навакола з трох бакоў працярэбленая лесасека, з чацьвертага боку — ляда з грэчкаю, палі, лугі ды сенажаці. Самае пчалінае жыцьцё. Улетку зьвініць пчэльня, як адзін рой, дрыжыць, як музыка, — нават трудна і сказаць, якое салодкае там хараство. Стаялі там на пасецы старыя раскідзістыя дрэвы, было шмат кустоў ляшчыньніку, абросшы высокаю пахучаю травою. Ліпы там цьвілі, многа дзятліны пасела на самых галах, мядуніцаю заўсёды пахла, і

ўсякіх дрэў і красак было даволі. Па ўсёй пчэльні або стаялі вульлі-стаякі, прывязаныя к дрэву ці к таўстому каляку, або на козлах абляглíся вялікія лежакі, і ўсе калоды былі добра дагледжаны, пакрыты бяростаю ці яловаю карою. З краю пчэльні, пры самых дзьверцах, стаяла пунька з пустымі вульлямі і з рознымі пчалярскімі прыладамі, у якой заўсёды надта прыемна пахла добрым зельлем, мятаю, мядуніцаю, мядком. Побач з пуняю стаяла невялічкая хацінка, дзе начаваў зямец улетку, а ўзімку жылі слабыя пчолы ў пастаўленых стоцьма і шчытна адна ля аднае калодках.

Сумны канец мела гэтая слаўная пчэльня, як і многае тады, у тым мінулым часе...

Дзед-зямец мог-бы адкупіцца ад паноў на вольніцу, ды, на жаль, не адкупіўся. Ці ён баяўся, што пан злупіць з яго вялікія грошы і згоніць далоў з пчэльні, ці ён прост ня мог сабе асвоіць думкі, што можа быць і з цэлым родам вольны, незалежны ад паноў.

Прышла яго старасьць, і перад сьмерцю хацеў зямец адказаць усю пчэльню аднаму старэйшаму сыну, а двум другім — усё іншае дабро. Але пан загадаў, каб падзяліў ён пчэльню між усіх траіх, — мусіць, разьлічаў з траіх зямцоў больш дані браць, чым з аднаго.

Не хацеў зямец дзяліць пчэльню, дужа не хацеў.

— Калі я, кажа, пчолак падзялю, загіне ўся мая пчэльня, бо тыя два сыны зусім нязручныя ля пчол хадзіць.

І як толькі ні даводзіў ён дурному пану, што дзяліць ня варта, але як і жонка яшчэ навялілася, каб дзяліў так, як пан кажа, каб ня крыўдзіў меншых сыноў, — прысілены быў падзяліць.

Аж як ён прарочыў, так і сталася. Заняд-балі сваіх пчолак маладзейшыя сыны, — ведама, іх сэрца да гэтай справы ня хілілася. Сталі ў іх пчолы паміраць, то з голаду, то з недагляду, ад мышэй, ад зьвяроў, а пад канец усунуўся гнілец. Як ні стараўся той старэйшы брат, ня мог даць рады. Перакінуўся гнілец і на яго часьціну. Гадоў за дзесяць пагінула ўся пчэльня. Адабраў пан пасеку, і за гадоў дваццаць пяць парос на ёй густы ельнік ды бярэзьнік.

І як толькі ў дзволду ён лупному пару, што дзядзін ня варта, але ня і жонка зацна навялілася, каб дзеду так, як пан кажа, каб на крынічы мешнік сынку, — прысягнуў ёму падзяліць.

Аж ж ён справіцу так і стаўся. Зонд біл сваіх двойаў малодшыя сыны — ведама ж іх сэрца да гатай справы да хіліцца. Стаў і іх мовы памірыць, то з гоццаў, то змаўляліся, да мышэй ад зьвяроў, а пад канец усе пачулі гнядзі. Як ні стаража той старэйшы брат, ня мог даць рады. Пераканаў гнядзі і на яго частку. І годоў за дзесяць патнула ўся шляхта. Аладорану пан пасеху, і за гадоў у ліцвіц паць парос ня сякуць сільнік да бярэзьнік.

[illegible]

З Ь М Е С Т

1964 г.

Бел. єлдзея
1964 г.

B0000000270155